ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 75 (4327)
НЯДЗЕЛЯ, 3 красавіка 1932 г.

МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

ПАСТАНОВА СНК СССР, ЦК УсеКП(б) і НАРКАМЗЕМУ СССР аб рабоце жывёлагадоўчых саўгасаў (1-я стар.).

ПАСТАНОВА АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМУ ЦК і ЦКК КП(б)Б аб правядзеньні веснавой с.-г. кампаніі 1932 году (2-ая стар.).

АРТЫКУЛЫ: П. АНДРОЎСКІ — Дунайскія лятуценьні п. Тард'е (4-ая стар.). Б. ІВАНОЎ — Першы ў свеце аўтагігант (Ніжагародзкі завод імя Молатава) (3-я стар.).

Генэральная праверка падрыхтаванасьці да сяўбы (2-ая стар.).

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА — Цьвёрдае і пасьлядоўнае правядзеньне беларусізацыі — адна з важнейшых задач у практычнымажыцьцёвым ленінскай нацпалітыкі (3-ая стар.).

Арганізацыя брыгад рабочых-тарфянікаў, давядзеньне да іх выробчых плянаў — баявыя задачы падрыхтоўкі да торфсэзону (4-ая стар.).

КІТАЙ: Акупанты рыхтуюцца да новых ваенных дзеяньняў (1-я стар.).

ПОЛЬШЧА Конная паліцыя ў Варшаве топча галодных (4-я стар.).

АБ РАБОЦЕ ЖЫВЕЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАЎ

Пастанова Савету Народных Камісараў СССР, Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) і Наркамзему СССР

I.

За апошнія 2 гады ў сыстэме Наркамзему створана вялізарная сетка жывёлагадоўчых саўгасаў, а іменна: арганізавана 1.480 саўгасаў са стадам у 2½ млн. штук буйнай рагатай жывёлы, 860 тыс. сьвіней і 4,7 млн. штук авец. Гэты размах разгортваньня жывёлагадоўчых саўгасаў патрабаваў з боку дырэктараў саўгасаў, саюзных аб'яднаньняў і абласных трэстаў належнай арганізацыі працы ў саўгасах і правільнага ўнутранога іх наладжаньня. Між тым, абсьледаваньне саўгасаў камісіямі ЦК і ЦКК паказала дрэннае кіраўніцтва работай жывёлагадоўчых саўгасаў з'боку Жывёлаводаб'яднаньня, Сьвінаводаб'яднаньня, Маслааб'яднаньня, Малакоаб'яднаньня РСФСР і птушкатрэстаў РСФСР і УССР і кіраўнікоў абласных трэстамі і дырэктараў саўгасаў.

Абсьледаваньне ўстанавіла наступныя буйнейшыя недахопы ў рабоце саўгасаў:

а) безгаспадарчасьць і поўную неналаджанасьць працэсаў вытворчасьці;

б) вусім нездавальняючую арганізацыю догляду жывёлы, празьмерна вялікі ўпадак маладняка, вялікі процант ялавасьці, зусім невыстарчальны рост стада за лік уласнага прыплоду і дрэнны стан стада;

в) разбазарваньне тавараў прадукцыі, самаснабжэньне і невыкананьне плянаў здачы дзяржаве;

г) выключна слабую арганізацыю працы;

д) поўную адсутнасьць гаспадарчага разрахунку і вельмі нездавальняючую пастаноўку справаздачнасьці ў саўгасах перад вышэйшымі органамі.

Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР лічаць недапушчальнымі і шкодным спробы асобных работнікаў жывёлагадоўчых саўгасаў і аб'яднаньняў замазаць гэтыя асноўныя недахопы ў рабоце саўгасаў, якія выцякаюць з дрэннага кіраўніцтва іх работай, спасылаючыся на тое, што жывёлагадоўчыя саўгасы знаходзяцца ў пачатковай стадыі будаўніцтва.

Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР пастанаўляюць прыпінаць недавальняючай работу Сьвінаводаб'яднаньня, Жывёлаводаб'яднаньня, Малакоаб'яднаньня РСФСР, птушкатрэстаў РСФСР і УССР і іх абласных трэстаў.

Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР папярэджваюць праўленьне Жывёлаводаб'яднаньня і, у прыватнасьці, яго старшыню т. Грушэўскага, праўленьне Сьвінаводаб'яднаньня і, у прыватнасьці, яго старшыню т. Харламова, праўленьне Малакоаб'яднаньня РСФСР і ў асаблівасьці праўленьня птушкатрэстаў РСФСР і УССР, што калі яны не даб'юцца сур'ёзнага паляпшэньня ў рабоце і ня зьніпчаць адзначаных буйнейшых недахопаў у рабоце саўгасаў, дык у адносінах да іх будуць прыняты суровыя меры спагнаньня.

Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР поўнасьцю ўхваляюць прадпрынятыя органамі Наркамзему СССР і мясцовымі партыйнымі і савецкімі органамі меры па ліквідацыі гэтых недахопаў, якія выявіліся ў зьнішчэньні з работы і аддаваньні пад суд дырэктараў жывёлагадоўчых саўгасаў, выкрытых у бегаспадарчасьці і разбазарваньні дзяржаўнай таварнай прадукцыі.

Савет Народных Камісараў СССР, ЦК УсеКП(б) і Наркамзем СССР лічаць неабходным давесьці да ведама савецкай грамадзкасьці сьпіс гэтых дырэктараў.

1. Па сьвінаводаб'ядна ньні

а) **Зьняты з работы з аддачай пад суд:** Заходняя Сібір — **Кактурскі** — саўгас «Травапольле», УССР — **Сітнік** — саўгас «Камсамолец»; БССР — **Скубакоў** — саўгас «Беліца»; Уральская вобласьць — **Філімонаў** — саўгас «Зара»; Заходняя вобласьць — **Дземінчук** — саўгас «Добрунь».

б) **Зьняты з работы без аддачы пад суд:** Заходняя вобласьць — **Дзюкоў** — Анонскі саўгас, **Бражыліс** — саўгас «Усходы»; Маскоўская вобласьць — **Сьлінкоў** — саўгас Зімінскі, **Банкаў** — саўгас Сасоўскі; ЦЧВ — **Кастаамараў** — саўгас «Праграс»; Украіна — **Ткачэнка** — саўгас імя Розы Люксэмбург; Ніжняя Волга — **Антонішкіс** — саўгас імя Нансэна; Сярэдняя Волга — **Ісанкоў** — саўгас «Кастрычніцкая рэвалюцыя»; Заходняя Сібір — **Худзякоў** — Лувінскі саўгас; Уральская вобласьць — **Ляпін** — Тамакульскі саўгас, **Братцаў** — саўгас «Чэткарына», **Годзін** — саўгас «Зара», **Кулакоў** — саўгас «Кургая»; Заходняя Сібір — **Зайцаў** — Мацкоўскі саўгас; Казакстан — **Кульценка** — саўгас № 641; Татрэспубліка — **Дзегцяроў** — саўгас «Нарты»; Паўночны Каўказ — **Жукоўскі** — саўгас «Ударнік».

2. Па жывёлаводаб'яднаньні

а) **Зьняты з работы з аддачай пад суд:** Паўночны Каўказ — **Пузанаў** — Завецінскі саўгас; Казакстан — **Курміс** — Прыгуральскі саўгас, **Байгулаў** — Арала-Цюбінскі саўгас.

б) **Зьняты з работы без аддачы пад суд:** Паўночны Каўказ — **Аброкаў** — Кабардзінскі саўгас, **Чычэнаў** — Балкарскі саўгас, **Слагада** — Ариавірскі саўгас, **Немчанка** — Каменскі саўгас; Украіна — **Лангут** — Чаплінскі саўгас; Сярэдняя Волга — **Іваноў** — саўгас Соль-Ілецкі, **Ізмайлаў** — Орскі саўгас, **Памыткаў** — саўгас «Маладая Гвардыя», **Цуканаў** — саўгас «Камінтэрн», **Грыгор'еў** — Першамайскі саўгас, **Чарноў** — Стаўропальскі саўгас; Ніжняя Волга — **Драгоніч** — саўгас Чарнышэўскі; Башкірыя — **Марпуль** — Алагузоўскі саўгас, **Гробаўскі** — Інякскі саўгас; **Клятончык** — Суваняскі саўгас; Уральская вобласьць — **Какорын** — Мокравусаўскі саўгас, **Калашнікаў** — саўгас Ташкаргана; Кіргізія — **Канеў** — саўгас «Кайцы»; Сярэдняя Азія — **Кочын** — Аламэдзінскі саўгас, **Ігнаценка** — саўгас «Ірысу», **Суконкін** — саўгас «Далдыбулак», **Фазееў** — саўгас «Шамоі», **Шаданаў** — саўгас «Саівон», **Леншын** — саўгас «Дангара», Казакстан — **Вялікасельцаў** — саўгас імя Ісаева, **Рэхін** — саўгас Тайнакоскі, **Джаманцаў** — саўгас Кзыл-Кзінскі, **Шукіна** — саўгас Байгунус, **Захараў** — саўгас Кастрычніцкі, **Карчмэр** — саўгас «Чакат», **Мечэзракоў** — саўгас імя Вакадарскага, **Літвінцаў** — саўгас Маржанскульскі, **Чубук** — саўгас Узэнкульскі, **Вараб'ёў** — саўгас Балактыкульскі; Усходняя Сібір — **Шарба** — саўгас імя Лоза, **Арбузоў** — саўгас імя Ал. Завадзкага.

3. Па маслааб'яднаньні

а) **Зьняты з работы з аддачай пад суд:** Паўночны Каўказ — **Парамонаў** — саўгас № 5, **Розанаў** — саўгас «Паўночная ферма № 7»; Заходняя Сібір — **Бебелеў** — саўгас № 51; Закаўказьце — **Мухтароў** — Аббабінскі, **Маханько** — саўгас Лысагорскі, **Дыянава** — саўгас Шамахінскі; ЦЧВ — **Крохін** — саўгас Талоўскі, **Пікман** — саўгас «Сьцяпны», **Прохараў** — саўгас Качаржынскі.

б) **Зьняты з работы без аддачы пад суд:** Паўночны Каўказ — **Зорын** — саўгас № 2, Заходняя Сібір — **Бялан** — саўгас № 46, **Карпуноў** — саўгас Яланскі; Закаўказьце — **Бушкензк** — саўгас Чармогільскі.

4. Па аўцаводаб'яднаньні

а) **Зьняты з работы з аддачай пад суд:** ЦЧВ — **Марчукоў** — саўгас імя Сталіна; Казакстан — **Сокалаў** — Бурмінскі саўгас; Украіна — **Старасьцін** — саўгас «Вольны»; **Крым** — **Судравін** — саўгас «Тагайлы», **Труеўцаў** — саўгас «Кірк-Інчунь».

б) **Зьняты з работы без аддачы пад суд:** Кіргізія — **Пархоменка** — саўгас Качкорка; Паўночны Каўказ — **Стальмакоў** — саўгас № 3; Казакстан — **Дзянісаў** — Акцюбінскі саўгас, **Шаронаў** — саўгас «Таз-Булак», **Тасымаў** — саўгас «Кзыл-Аскерскі», **Князеў** — Атбасарскі саўгас; Уральская вобласьць — **Багачоў** — саўгас «Брэды»; Кіргізія — **Дуко** — саўгас «Ільліч»; ЗСФСР — **Садыхаў** — саўгас «Мінгечаур».

5. Па птушкааб'яднаньні РСФСР

а) **Зьняты з работы з аддачай пад суд:** ЦЧВ — **Бутаў** — саўгас «Чырвоны Кастрычнік», **Ляпкоўсні** — саўгас «Кінякоўскі», **Ванаг** — саўгас «Сьцяпное гняздо»; Іванаўская вобласьць — **Васільеў** — саўгас «Пахарь»; Паўночны Каўказ — **Вэстфаль** — саўгас «Гігант», **Зянкоў** — саўгас Ейскі; Заходняя Сібір — **Гамбар'ян** — саўгас № 81; Сярэдняя Волга — **Тэльвоў** — саўгас «Марат»; Ніжняя Волга — **Яфімаў** — саўгас Царэўшанскі, Маскоўская вобласьць — **Ілюшын** — саўгас «Піўчнае»; Заходняя вобласьць — **Масэн** — саўгас «Емянец».

б) **Зьняты з работы без аддачы пад суд:** Заходняя вобласьць — **Кір'янаў** — саўгас «Белаводка»; Маскоўская вобласьць — **Барысаў** — саўгас «Сабліны»; ЦЧВ — **Андрэенка** — саўгас Аржэнка, **Лебедзеў** — Бесанаўскі саўгас, **Багінаў** — Прохараўскі саўгас, **Васільеў** — Барысаглебскі саўгас; Кіргізія — **Кісялёў** — саўгас Першамайскі; Кабардына - Балкарская вобласьць — **Баянаў** — саўгас Курпужын; Паўночны Каўказ — **Папоў** — саўгас Лобінскі, **Калесьнікаў** — Кубанскі саўгас, **Мельнікаў** — Новаомскі саўгас № 80; Крым — **Гаўрылаў** — саўгас «Залесьне».

6. Па малакоаб'яднаньні РСФСР

а) **Зьняты з работы з аддачай пад суд:** Заходняя вобласьць — **Лахматаў** — саўгас «Эдо», **Канашкін** — саўгас «Талешкіна».

б) **Зьняты з работы без аддачы пад суд:** Заходняя вобласьць — **Дземін** — саўгас імя Фрунзэ, **Звін** — саўгас «Андрэйкава», **Барсукоў** — саўгас Цяраніна, **Сталбоў** — саўгас Хоцькава; Іванаўская вобласьць — **Курыгін** — саўгас Белікава, **Хрэнаў** — саўгас Цітан, **Барадулін** — саўгас «Краснагорка», **Сьпірыдонаў** — саўгас імя Фрунзэ; Ніжнягародзкі край — **Іваноў** — саўгас імя Калініна, **Цьвяткоў** — саўгас Іванаўскі, **Баранаў** — саўгас Бароўскі; Ленінградская вобласьць — **Кірэяў** — саўгас «Гасьціліцы», **Карэль** — саўгас «Пралетарская праца»; Маскоўская вобласьць — **Рабцаў** — саўгас «Клепікі», **Рабаў** — саўгас «Панова», **Кельт** — саўгас «Пяцігодка», **Аніксеў** — саўгас Юр'ева.

Савет Народных Камісараў СССР, ЦК УсеКП(б) і Наркамзем СССР падкрэсьліваюць, што ў рэзультаце адзначанай вышэй бегаспадарчасьці, разбазарваньня дзяржаўнага дабра і ўсякіх іншых агіднасьцей, плян здачы мяса для гарадоў аказаўся выкананым жывёлагадоўчымі саўгасамі ў 1931 годзе толькі на 69 проц., чым была нанесена вялізарная страта справе снабжэньня рабочых, снабжэньня арміі і іншых працоўных у гарадох.

II.

У адпаведнасьці з тым, што галоўнай задачай у галіне будаўніцтва жывёлагадоўчых саўгасаў у 1932 г. зьяўляецца поўнае выкананьне плану здачы імі мяса, масла і воўны — Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР пастанаўляюць:

1. Вызначыць на 1932 год здачы плян здачы:

а) па **Жывёлаводзе:** мяса — 1.500.600 пуд. і масла 610.000 пуд.;

б) па **Сьвінаводзе:** мяса — 3.660.000 пудоў;

в) па **Маслааб'яднаньні:** мяса — 326.411 пудоў і масла — 640.500 пуд.;

г) па Аўцаводаб'яднаньні: мяса — 1.129.781 пуд. і воўны — 773.000 пудоў.

2. Камплектаваньне як старых, так і новых жывёлагадоўчых саўгасаў буйнай рагатай жывёлай і сьвінямі за кошт Саюзмяса спыніць з тым, каб у далёкім рост стада саўгасаў іншоў за кошт іх уласнага прыплоду.

Пакінуць у выглядзе выключэньня, з прычыны таго, што саўгасы Аўцаводаб'яднаньня з прычыны асаблівай важнасьці павялічэньня таварнай прадукцыі воўны і водаб'яднаньня параўнаўча больш здавальняюча асвоілі вытворчасьць, камплектаваньне Аўцаводаб'яднаньня аўцамі за кошт Саюзмяса ў 1932 годзе, абмежкаваўшы разьмеры гэтага камплектаваньня 1,8 млн. штук. Камплектаваньне Маслааб'яднаньня ў раёнах экспартнага вырабу масла ўстанавіць у колькасьці 78.000 кароў.

3. Адмовіцца ад арганізацыі зімовага апаросу ў саўгасах Сьвінаводаб'яднаньня на бліжэйшыя два гады за выключэньнем паўднёвых раёнаў УССР, Паўночнага Каўказу і Закаўказьля.

4. Абмежаваць у 1932 годзе будаўніцтва новых саўгасных па Сьвінаводаб'яднаньні 20 саўгасамі (у раёнах мясакамбінатаў), па Маслааб'яднаньні — 22 саўгасамі (у раёнах экспартнага вырабу масла) і па Аўцаводаб'яднаньні — 16 саўгасамі (ня лічачы тых новых саўгасаў, якія будуць створаны ў выніку разбуйненьня зараз існуючых саўгасаў - гігантаў).

5. Даручыць Наркамзему СССР правесьці ў далёкім наступны парадак будаўніцтва і прыёмкі новых саўгасаў, а іменна: камплектаваньне саўгасаў жывёлай робіцца толькі пасьля сканчэньня ўсяго будаўніцтва, прычым прыёмка адбудаваных саўгасаў павінна праводзіцца спэцыяльнымі прыёмачнымі камісіямі ў тым-жа парадку, у якім праводзіцца прыёмка новых прадпрыемстваў у прамысловасьці.

6. Даручыць Наркамзему СССР правесьці разбуйненьне існуючых саўгасаў і трэстаў, устанавіўшы:

а) гранічны разьмер саўгасу па Жывёлаводаб'яднаньні, у залежнасьці ад умоў раёну, ня зьвыш 3-8 тысяч штук;

б) гранічны разьмер саўгасу па Маслааб'яднаньні, у залежнасьці ад умоў раёну няз выш 1.000 кароў, фэрмы саўгасу ў 200-400 кароў;

в) гранічны разьмер саўгасу па Аўцаводаб'яднаньні па грубаваўняных аўцах ня звыш 50.000 штук, па племянных аўцах ня звыш 10.000 штук;

г) гранічны разьмер саўгасу па Сьвінаводаб'яднаньні: для спажывацкіх палясы, БССР, ЗСФСР—400 сьвіноматак, для УССР і ЦЧВ — 700 сьвіноматак; для іншых раёнаў — 1.000 сьвіноматак; разьмер сьвінафэрмы вызначыць у 100-150 сьвіноматак.

7. Зацьвердзіць мерапрыемствы, што праводзяцца Наркамземам СССР па арганізацыі ў кожным жывёлагадоўчым саўгасе фэрм з закончаным зваротам стада, г. зн. маючых пастаянны матачны склад, пэўную праграму гадоўлі стада, здачы прадукцыі, а таксама правядзімыя Наркамземам мерапрыемствы па сканцэнтраваньні ў цэнтральнай сядзібе саўгасу кіраўніцтва машына-трактарнай базай, арганізацыяй паляводзтва, снабжэньнем кармамі і кантролю за ўсёй работай фэрмы.

8. Даручыць Наркамзему СССР пры скарыстаньні адпушчаных на капітальнае будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах сродкаў забясьпечыць у першую чаргу за ўсіх арганізаваных у 1931 годзе і разбуйненых саўгасах поўнасьцю арганізацыю водаснабжэньня, жыльля для пастаяннага кадру рабочых і спэцыялістаў і будаўніцтва цёплых памяшканьняў для ўсяго маладняка, у тым ліку прыплоду вясны 1933 году.

9. Даручыць Наркамзему СССР закончыць рэарганізацыю жывёлагадоўчых саўгасаў і трэстаў да 1 жніўня 1932 году.

10. Для арганізацыі справы снабжэньня рабочых, служачых і спэцыялістаў жывёлагадоўчых саўгасаў арганізаваць у складзе Цэнтрасаюзу на правах асобнай сэкцыі спажывецкую кааперацыю жывёлагадоўчых саўгасаў, аналёгічную транспартнай.

III.

Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР адзначаюць, што з боку Наркамзему СССР і яго мясцовых органаў ня было належнага кантролю за работай жывёлагадоўчых саўгасаў, трэстаў і аб'яднаньняў, ня было забясьпечана належнае штодзённае кіраўніцтва арганізацыяй вытворчасьці ў жывёлагадоўчых саўгасах. З прычыны гэтага:

1. Даручыць Наркамзему СССР узмацніць штодзённы кантроль і кіраўніцтва ўсёй тэмай жывёлагадоўчых саўгасаў, іх трэстаў і аб'яднаньняў.

2. Даручыць Наркамзему СССР прызначыць у кожны жывёлагадоўчы саўгас кантралёра Наркамзему СССР з тымі-ж правамі, што і ў збожжасаўгасах.

Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР таксама адзначаюць, што кантроль за работай і дапамога жывёлагадоўчым саўгасам з боку краявых партыйных і савецкіх органаў дагэтуль зусім невыстарчальны. Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР звяртаюць увагу ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый на тое, што жывёлагадоўчыя саўгасы, як новая і цяжкая справа, патрабуюць штодзённай дапамогі і кантролю з боку мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый.

Старшыня СНК СССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар ЦК УсеКП(б)
І. СТАЛІН.
Наркамзем СССР
Я. ЯКАЎЛЕЎ.

АДКАЗ тав. СТАЛІНА

на запытаньне буржуазнага журналіста

І. Сталіну

Генэральнаму сакратару ЦК УсеКП(б)

Сэр!

Чужаземныя газэты апублікавалі паведамленьне аб тым, што адзін берлінскі ўрач, спэцыяліст па ўнутраных хваробах выкліканы у Маскву для назначэньня вам лячэньня.

«Асошыэйтэд Прэс» была-б рада даведацца ад вас, або ад вызначанай вамі асобы, наколькі гэтае паведамленьне правільна, або ілжывае. Як вам добра вядома, чуткі падобнага роду ўладаюць здольнасьцю папырацца і прымаць разьмеры надзвычай перашкаджалічных і трывожных паведамленьняў. Непасрэдная ваша заява можа прапуча абвергнуць гэтыя чуткі.

Зусім адданы вам — **Стэнлі П. Рычардсон.**

Пану Рычардсону

Хлусьлівыя чуткі аб маёй хваробе папырающца ў буржуазнай прэсе ня ў першыню. Ёсьць, відавочна, людзі, якія зацікаўлены ў тым, каб я захварэў сур'ёзна і надоўга, калі ня горш. Можа гэта і ня зусім далікатна, але ў мяне няма, на жаль, даных, якія могуць парадаваць гэтых паноў. Як гэта ня сумна, а супроць фактаў нічога ня зробіш: я зусім здаровы. Што датычыць п. Цондэка, ён можа заняцца здароўем другіх таварышоў, для чаго ён і запрошан у СССР.

І. СТАЛІН.

ПАСЕЎНЫЯ ГРУЗЫ ПРАСОЎВАЦЬ У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

Дырэктарам дарог, дарпартарганізатарам, дарпрафсачам, ДТООДПУ дарог: Паўночна-Каўказкай, Паўднёва-Усходняй, Разана-Уральскай, Масква-Казанскай, Самара-Златаўсьцінскай, Паўночнай, Пермскай, Омскай, Томскай, Маскоўска - Курскай, Паўднёвай, Кацерынінскай, Паўднёва-Заходняй, Заходняй.

У мэтах максымальнага паскарэньня прасоўваньня веснавых насенных грузаў, тэрміновага адхіленьня найменных затрыманьняў іх у дарозе, забясьпячэньня своечасовага прыбыцьця іх на станцыі назначэньня прапануем: тэрміновага арганізаваць дарожныя чацьвёркі ў складзе дырэктара чыгункі, партарганізатара, старшыні дарпрафсачу, начальніка ДТООДПУ; раённыя чацьвёркі ў складзе: начальніка раёну, сакратара-арганізатара, старшыні райпрафсачу, начальніка раённага ДТООДПУ; на рашаючых станцыях — тройкі ў складзе: сакратара ячэйкі, начальніка станцыі, старшыні мясцкому.

Насенныя грузы адпраўляць у першую чаргу пераважна перад усімі іншымі грузамі.

Выясьніце, дзе, якія насеўныя грузы затрымаліся ў дарозе і хутка забясьпечце іх адпраўленьне. На рашаючыя станцыі раёну камандзіруйце сваіх прадстаўнікоў з абавязацельствам дабіцца прыняцьця ўсіх захадаў для своечасовага адпраўленьня і бесперабойных перавозак.

За найменшае праўленьне нядбайнасьці, затрыманьне грузаў без прычын, маруднасьць у рабоце прымяняйце да самай суровай адказнасьці.

Тройкам «вменяется» ў абавязак безумоўна дастаўляць у пункты назначэньня не пазьней 1 красавіка ўсе насенныя грузы, адпружаныя да 26 сакавіка.

Нам. Наркома шляхоў зносін
БЛАГОНРАВАЎ.
Партарганізатар НКШ Зносін
АМОСАЎ.
ЦК чыгуначнікаў
ВАНЬЯН.
ТООРДПУ
ПРОХАРАЎ.

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

ад 21 сакавіка 1931 г.

Аб прасоўваньні насеўных грузаў па чыгунцы без чаргі

1. Загад НКПЗ ад 29 сакавіка аб прасоўваньні ў першую чаргу насеўных грузаў па чыгунцы апублікаваць у мясцовых газэтах не пазьней 1 красавіка 1932 году.

2. Прапанаваць ГК і РК і партарганізатарам раёнаў, зараз-жа арганізаваць раённыя чацьвёркі, а на рашаючых станцыях—тройкі.

3. Усю працу пастаўніц сугубай аператыўнасьцю з прыняцьцем суровых мер пакаранньня па ўсіх фактах назначаньня, як за зрыў веснавой насеўнай кампаніі.

Сакратар ЦК КП(б)Б
ІВАНОЎ.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

ПЕРАДАВІКІ РАПАРТУЮЦЬ АБ ПЕРАВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ

ПЕРАМОГА ГОМСЕЛЬМАШУ

ГОМЕЛЬ. (ПА ТЭЛЕФОНУ). ЗАВОД ГОМСЕЛЬМАШ ДА 29 САКАВІКА ПЕРАВЫКАНАЎ ПРАМФІНПЛЯН ПЕРШАГА КВАРТАЛУ. ПАВОДЛЕ ЗАДАНЬНЯ ТРЭБА БЫЛО ВЫПУСЬЦІЦЬ ЗА КВАРТАЛ ПРАДУКЦЫІ ПА 2.600.000 РУБ., ВЫПУШЧАНА НА 2.612 ТЫС. РУБ. — 102,3 ПРОЦ. КВАРТАЛЬНАГА ПЛЯНУ. ЗАМЕСТ 1.760 СІЛАСАРЭЗАК ВЫРАБЛЕНА 1.782 — 101,9 ПРОЦ. ЗАМЕСТ 1.000 СЯЧКАРАНЬ ВЫПУШЧАНА 1.054 — 105,4 ПРОЦ.

Бярэзінскі камбінат з посьпехам скончыў першы квартал

БАРЫСАЎ. (Па тэлеграфу). Бярэзінскі камбінат выканаў прамфінплян першага кварталу па запалках на 100,1 проц., па фанэрных сядзеньнях — на 100 проц., па выпрацоўцы электраэнэргіі — на 104,8 проц.

ЯФІМЕНКА, ГАЙДУК, ЗАХАРЫН.

107 ПРОЦ. КВАРТАЛЬНАГА ЗАДАНЬНЯ

БАБРУЙСК. Беларэўны цэх БАБРУЙСКАГА ДРЭВААПРАЦОЎЧАГА КАМБІНАТУ выканаў на 30 сакавіка квартальнае заданьне на 107 проц., пра грэму па экспартных матар'ялах — на 101 проц.

Цэх стандартных дамоў выканаў квартальны плян на 100,3 проц., выпусьціў 236 дамоў.

РЭДКАЛЕГІЯ ЦМАТТЫРАЖКІ «ЗА УДАРНЫЯ ТЭМПЫ».

Прамфінплян перавыкананы

Пад кіраўніцтвам фабрычнай парт-арганізацыі і Менгаркому КП(б)Б, дзякуючы разгортваньню сацыспаборніцтва і ўдарніцтва і мабілізацыі рабочага калектыву на рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна, **фабрыка «Беларуска»** выканала плян першага кварталу на 106 проц., выпусьціўшы прадукцыі на 812.000 руб. Прадукцыйнасьць працы аднаго рабочага склала 43 руб. 59 к. супроць 42 руб. 52 к. паводле пляну, што роўна 102,5 проц.

На фабрыцы працуюць 32 ударныя брыгады, якія ахапляюць 285 чал., з іх 17 гаспадарча - разрахункавых. Рэалізаваны за першы квартал рабочыя прапановы даюць гадавую эканомію ў 41.000 руб.

Нашы недахопы — перарасход фонду зарплаты ў студзені, нездавальняючае становішча з якасьцю прадукцыі і далёка няпоўная перабудова партыйна - гаспадарчай работы. З гэтымі хібамі мы зараз вядзем рашучую барацьбу.

Дырэктар фабрыкі
РЫС.
Сакратар парт'ячэйкі
БАЦЬВІНЬНІК
Старшыня фабкому
БУЛКІН.

Замацоўваем дасягнутыя тэмпы

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу).

ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ, ЦП саюзу машынабудаўніцтва, Белметаллаб'яднаньню і «Зьвязідзе».

Дзякуючы бальшавіцкай барацьбе за выкананьце 6 умоў тав. Сталіна, віцебская ачэсная фабрыка выканала плян першага кварталу на 101,24 проц. Замацоўваем, разьвіваем дасягнутыя тэмпы.

Дырэктар ачэснай фабрыкі
Арэшка.
Сакратар парткамітэту
Юнсьлер
Старшыня фабкому

Рапартуе другі хромавы цэх заводу „Бальшавік"

Другі хромавы цэх чырвонасьцяжнага заводу «Бальшавік», які выйшаў пераможцам у міжцэхавым конкурсе, другім паўгодзьдзі 1931 году, [illegible] свае тэмпы у барацьбе за прамфінплян першага кварталу чацьвёртага, заключнага. Калектыў другога хромавага цэху да тэрміну 29 сакавіка выканаў прамфінплян першага кварталу ў колькасным азначэньні на 101,9 проц., у ценнасным — на 106,7 проц.

Загадчык тэху
ДУШАЦКІ.
Сакратар парт'ячэйкі
ЗАПОЛЬСКІ.
Старшыня цэхпрафкому
[illegible]

Акупанты рыхтуюцца да новых ваенных дзеяньняў

АБОДВЫ БАКІ КАНЦЭНТРУЮЦЬ СВАЕ СІЛЫ

Японцы пасьпешна будуюць другую лінію умацаваньняў

ШАНХАЙ, 1. Перагаворы, якія цягнуліся ўсю раніцу, — гаворыцца ў камюніке канфэрэнцыі, — значна прасунуліся наперад. Работа канфэрэнцыі адкладваецца да суботы. Дэлегаты канфэрэнцыі — прадстаўнікі дзяржаў, якія прысутнічалі на апошнім пасяджэньні, адмаўляюцца паведамляць, у чым сутнасьць дасягнутага прагрэсу ў перагаворах. Ваенная падкамісія, якая таксама паведаміла аб дасягненьні некаторых станоўчых рэзультатаў у перагаворах, прыняла тым ня менш пастанову — запатрабаваць новых інструкцый і адклала свае пасяджэньні на невызначаны тэрмін.

Пакуль адбываюцца перагаворы, **войскі абодвух бакоў заняты ўмацаваньнем сваіх пазыцый.** Паміж перадавымі часьцямі японскіх і кітайскіх войск адбываецца перастрэлка па ўсёй лініі фронту Люхэ-Нансяц. Указваюць, што кітайскія войскі канцэнтруюцца ўздоўж ракі Цзінян. Галоўныя сілы 19 арміі размешчаны вакол Гуйшаня. Дапаможныя часьці вакол Сучжоу і Усі. 14 дывізія японскіх войск размешчана ў раёне Люхэ-Цзянцзін. Асноўныя сілы 9-й дывізіі японскіх войск — у Нансяне. Другая лінія японскіх умацаваньняў, якая заканчваецца будаўніцтвам, ідзе на захад ад Цзянвана і будзе прадоўжана па поўнач у напрамку да Ўсуна (ТАСС).

На фронце бязупынныя перастрэлкі і сутычкі

ШАНХАЙ, 1. Згодна паведамленьня кітайскіх крыніц японскія салдаты ў шпацкай вопратцы з кулямётамі прабавалі прасунуцца ў напрамку да Дайчжану. Пасьля новага перастрэлкі японцы адступілі. Асобныя выступленьні японскіх салдат, частыя перастрэлкі ствараюць напружанае становішча, у прыватнасьці ў раёне Нандао, дзе зноў абвешчана ваенае становішча.

Тысячы кітайскіх трупаў у каналах

ШАНХАЙ, 1. Санітарная камісія міжнароднага сэтльмэнту, якая праводзіла ачыстку Чапэю і вуліц сэтльмэнту, што прылягаюць да Чапэю, апублікавала даклад. У гэтым дакладзе ўказваецца, што апрача ачысткі вычыстот, якія пагражалі выклікаць эпідэмію, камісія вывезла каля тысячы трупаў, загінуўшых у часе бядаўніх падзей. Шмат трупаў знойдзена ў каналах, вада якіх ачучала.

Пабудова магутнага ваеннага заводу ў Манжурыі

БЭЙПІН, 1. Дайрэнская газэта «Нансэй Ніпо» паведамляе, што Паўднёва-Манчжурская чыгунка канчаткова пераняла **пабудаваць сталіліцейны завод на тэрыторыі Манчжурыі, недалёка ад Мукдэну.**

Агэнцтва «Сімбун Рэнга» паведамляе, што ў Мукдэне створана прадстаўніцтва ваеннага міністэрства Японіі з мэтай ажыцьцявіць плян замены ўвозу жалеза, нафты і іншых прадуктаў, неабходных для ваеннага міністэрства з Амэрыкі, Індыі, увозам з Манчжурыі. **Пастаноўлена падвоіць прадукцыйнасьць Аньшанскага жалезаапрацоўчага заводу, даводзячы вытворчасьць да ½ млн. тон у год.**

Пошта, мыты, саляная мана полія--у руках акупантаў

ТОКІЕ. 1. Агэнцтва «Сімбун Рэнга» паведамляе, што манчжурскі ўрад абвясьціў аб пераходзе з 1 красавіка манчжурскіх поштаў пад яго кантроль. Пераход мытніц пад кантроль новага ўраду скончыцца ў бліжэйшыя дні.

ШАНХАЙ. Нанкінскі ўрад атрымаў афіцыяльнае паведамленьне, што новы Манчжурскі ўрад сілай захапіў кіраўніцтва саляных даходаў у Інкоу, абвясьціў аб закрыцьці канторы інспэктара саляных даходаў, перадачы яго функцый пока-назначанаму камісару.

„Чайна Уіклі Рэв'ю" аб пэрспэктывах японска-амэрыканскай вайны

ШАНХАЙ. Камэнтуючы ліст Стымсона да сэнатара Бора, амэрыканская часопісь у Кітаі «Чайна Уіклі Рэв'ю» піша: «Калі ліст Стымсона мае які-небудзь сэнс, а мы думаем, што ён мае сэнс, дык ён азначае, што **АМЭРЫКА НЕАДКЛАДНА ПРЫСТУПІЦЬ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ДА БАРАЦЬБЫ, ЯКАЯ НЯМІНУЧА ПАВІННА АДБЫЦЦА.** Гэта ня значыць, што вайна паміж ПАЗШ і Японіяй узьнікне на наступным тыдні, або ў будучым годзе, але калі Японія не паменшыць тэмпаў сваіх дзеяньняў, дык такі канфлікт узьнікне». Далей часопісь ставіць пытаньне: ці будзе гэты канфлікт толькі паміж дзьвюма дзяржавамі, ці ў яго будуць уцягнуты і іншыя дзяржавы? «Цяперашняе становішча,—адказвае часопісь,—указвае, што канфлікт будзе шматбаковым. Гэтак саме, як могуць быць самыя назвычайныя блёкі ва ўнутранай палітыцы, таксама

Аб правядзеньні веснавой с.-г. кампаніі 1932 году

ПАСТАНОВА АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМУ ЦК І ЦКК КП(б)Б

...фэрэнцыя паставіла ...чай у галіне сельска-...творчасьці ў 1932 г. і ...цы рашучае павышэнь...сьці калгасных і саўгас...ву і барацьбу за высокую пра...цыйнасьць сельскай гаспадаркі. ...ы гэтым «задачы арганізацыйна-...спадарчага ўмацаваньня калгасаў і ...лістычнага перавыхаваньня кал...ных мас павінны стаяць у цэнтры ...і ў другой пяцігодцы» (XVII парт ...фэрэнцыя).

Трэцяя бальшавіцкая вясна павінна ...равесьці пад знакам барацьбы за ар...ізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне ...калгасаў, за агратэхніку, укараненьне ...севазваротаў, за высокую якасьць ...апрацоўкі глебы, барацьбы са страта...мі, узорнай арганізацыі ўборкі, што ...зьяўляецца сустаўной часткай арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня ...калгасаў і якаснага павышэньня кал...гасной вытворчасьці.

Асноўнымі асаблівасьцямі веснавой ...сяўбы г. г. зьяўляюцца: рашаючыя ...перамогі партыі, дасягнутыя ў галіне ...індустрыялізацыі краіны, у сацыялі...стычнай рэканструкцыі сельскай гас...падаркі, у выніку чаго калгасы і саў...гасы займаюць пераважнае месца ў ...сельска-гаспадарчай вытворчасьці; у ...часе веснавой сяўбы на калгасных па...лёх БССР будуць працаваць 57 МТС ...з трактарным паркам у 18.400 НР. ...Далейшае абвастрэньне клясавай ба...рацьбы, якое выклікаецца разгорну...тым гацыялістычным наступленьнем ...на ўсіх франтох будаўніцтва і супра...ціўленьнем гэтаму, наступленьню ад...жываючых і ліквідуемых капіталі...стычных элемэнтаў, якія прыстасоў...ваюць новыя формы і мэтады барацьбы супроць мерапрыемстваў партыі і ўлады.

Барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў зьяўляецца барацьбой за ўмацаваньне сельска-гаспадарчай арцелі. Рашаючае значэньне ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў зьяўляецца арганізацыя працы на аснове брыгаднага мэтаду, як лепшай формы, якая забясьпечвае максымальную прадукцыйнасьць працы, ліквідацыю ўраўнілаўкі і абязьлічкі.

1. На 20/III па рэспубліцы ссыпана: насеннефондаў — 64,19 проц., у тым ліку тэхнічных — 46,3 проц., страхфондаў у калгасах — 52,9 проц., у аднаасобнікаў — 11,2 проц. Такое становішча тлумачыцца тым, што з боку раённых арганізацый не ...ведзена і не ўзначалена ініцыятыва калгасьнікаў па арганізацыі міжраённай і міжкалгаснай узаемадапамогі, рэалізацыі насеннай пазыкі і г. д.

2. Рамонт па ўсіх с.-г. сыстэмах ...шын: на трактарах — на 69,9 проц., трактарных плугох — на 64,7 проц., конных плугох — на 61 проц., ...ніварках — на 70,5 проц., калёсах — на 41,6 проц. Ёсьць значнае адставаньне ў прасоўваньні сельска-гаспадарчых машын са складаў і будаўніцтве нафтахавальнікаў, прычым загрузка наўных нафтахавальнікаў праходзіць яўна незадавальняюча.

3. Давядзеньне пляну веснавой сяўбы на калгасаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у парадку самаабвязацельстваў ня скончана.

Непоўнасьцю даны цьвёрдыя заданьні на сяўбе кулацка-заможным гаспадаркам. Дрэнная арганізацыйнае кіраўніцтва з боку трэстаў і раённых арганізацый саўгасамі ў падрыхтоўцы да сяўбы. Зусім незадавальняючы ход падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ў аднаасобным сэктары.

4. Пленум ЦК і ЦККК адзначае асаблівае незадавальняючае правядзеньне ...рыкмэтнаў па ўздыме ўраджайнасьці і ўкараненьні агратэхнікі. У радзе раёнаў існуе палітычная недаацэнка мерапрыемстваў па ўздыме ўраджайнасьці і ўкараненьні агратэхнікі (вызначэньне ворагаў, ачыстка насеньня, збор попелу, завоз мінэральнага ўгнаеньня і інш. мерапрыемствы маруда выконваюцца).

5. Пленум асабліва падкрэсьлівае незадавальняючую падрыхтоўку да сяўбы і амаль адсутнасьць сапраўднага спаўрэ да практычнай арганізацыі ...гаснай вытворчасьці ў наступных раёнах: Ярысенскім, Расонскім, Барысаўскім, Цярахаўскім, Лельчыцкім, Пінскім, Пятрыкоўскім, Гомельскім, Жагомльскім, Лагойскім і Пухавіцкім.

6. У радзе раёнаў не дасцца рашучага адпору кулацкай агітацыі за разбазараньне коняй і фуражных фондаў. Ня створаны належныя фуражныя фонды і по разгорнута ўзаемадапамога па кармовых рэсурсах па час правядзеньня сяўбы і эканомія ў выдаткаваньні іх.

7. Плян падрыхтоўкі кадраў масавай кваліфікацыі выкананы толькі на 40 проц., у тым ліку па трактарыстах-рулевых — 58 проц., брыгадзірах і ільну і канапель — на 14,4 проц. Па раёнах — Бешанковіцкім, Глускім, Жыткавіцкім, Лоеўскім, Плешчаніцкім, Прапойскім, Сіроцінскім, Смалявіцкім, Цярахаўскім, Чэрыкаўскім — падрыхтоўка кадраў да веснавой сяўбы зусім сарвана. З боку сельска-гаспадарчых трэстаў ня прынята необходных захадаў да сваячасовага правядзеньня арганізаванага набору рабсілы ў саўгасах, укараненьня зьдзельшчыны, рэальнай зарплаты і арганізацыі працы на аснове шасьці ўмоў т. Сталіна.

8. Прафсаюзы (асабліва сельска-гаспадарчыя), камсамол і шэфскія арганізацыі незадавальняюча разгарнулі работу па падрыхтоўцы да веснавой кампаніі.

Слаба разгорнута масавая работа і канкрэтнае, арганізацыйнае кіраўніцтва ...тыйныя, савецкія і зямельна-калгасныя арганізацыі ў большасьці раёнаў БССР не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з пастановамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, не ўзяліся па-сапраўднаму за выкананьне гэтых пастаноў, не перанесьлі цэнтру цяжару падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі на арганізацыю брыгад — асноўнага зьвяна калгаснай вытворчасьці, не мабілізавалі мас рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў і не забясьпечылі стварэньня брыгад па вытворчым прынцыпе, а ў некаторых раёнах (у прыватнасьці, у Смалявіцкім і Талачынскім) фармальна падыйшлі да арганізацыі калгасных брыгад, ня вызначыўшы за брыгадамі пастаяннага складу калгасьнікаў, не замацаваўшы пастаяннага зямельнага вучастку, інвэнтару, працоўнай жывёлы, пасеньня і фуражу.

Да гэтага часу зусім невыстарчальна разгорнута работа па вылучэньні і выхаваньні калгаснага актыву.

Пленум ЦК і ЦККК КП(б)Б прызнае становішча з падрыхтоўкай да сяўбы і ход выкананьня дырэктыў аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў нездавальняючым і паказвае, што падрыхтоўка і правядзеньне 3-й бальшавіцкай сяўбы зьяўляецца зараз асноўнай важнейшай задачай усёй КП(б)Б, якая (задача) зьвязана з выкананьнем пляну 4-га, заключнага году пяцігодкі.

Пленум ЦК і ЦККК КП(б)Б прапануе:

1. Партыйным, савецкім і зямельна-калгасным арганізацыям безадкладна прыступіць на справе да арганізацыі вытворчых брыгад з пастаянным складам калгасьнікаў, прымацаваўшы да іх пэўныя вучасткі, сельска-гаспадарчы інвэнтар, цягавую сілу і выдзеліўшы ў адпаведнасьці з вытворчым планам брыгады патрэбную колькасьць пасеньня, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на падбор і вылучэньне брыгадзіраў са складу ўдарнікаў-калгасьнікаў, вядучы барацьбу супроць цякучасьці іх складу. Павысіць палітычную і гаспадарчую кваліфікацыю брыгадзіраў. Разгарнуць работу вытворчых парад у калгасах.

Пленум прызнае становішча кіраўніцтва калгаснай вытворчасьцю як з боку цэнтру раёнамі, так раёнаў непасрэдна калгасамі, не адпавядаючым сучасным патрабаваньням і даручае бюро ЦК распрацаваць мерапрыемствы па ўмацаваньні кіраўніцтва ў гэтай галіне.

Пленум абавязвае партыйныя і савецкія арганізацыі забясьпечыць арганізаванае правядзеньне адыходніцтва з калгасаў і рашучую барацьбу з самацёкам у гэтай справе, даручаючы бюро ЦК на бліжэйшым пасяджэньні распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па гэтым пытаньні.

Пленум прапануе партарганізацыям разгарнуць рашучую барацьбу з самацёкам у калгасным руху з тым, каб на аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў завярнуць суцэльную калектывізацыю БССР у 1932-33 г.

Пленум прапануе партарганізацыям разгарнуць работу па выхаваньні і вылучэньні калгаснага актыву (курсы, канфэрэнцыі і рад іншых мерапрыемстваў), на які необходна апірацца пры правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў па веснавой сяўбе.

2. Скончыць стварэньне пасенных і страхавых фондаў да 10-га красавіка, шырока разгарнуўшы барацьбу за пасеньне, за арганізацыю міжраённай і міжкалгаснай узаемадапамогі, за рэалізацыю пасеннай пазыкі, арганізацыю буксірных брыгад, усямерна захвочваючы ініцыятыву калгасьнікаў у гэтай справе. Пленум папярэджвае, што стварэньне пасенных і страхавых фондаў зьяўляецца асноўнай задачай падрыхтоўкі да сяўбы, ад пасьпяховага выкананьня якое будзе залежаць выкананьне плянаў сяўбы.

Разам з тым пленум падкрэсьлівае, што засеў намечанай плошчы павінен поўнасьцю праходзіць за кошт мабілізацыі ўнутраных пасенных рэсурсаў. Необходна рашуча змагацца са спажы вецкімі настроямі, якія выяўляюцца ў імкненьні зьмяншыць пасевы вядучых культур за кошт спажывецкіх культур.

Пленум расцэньвае гутаркі аб нерэальнасьці пасеўных плянаў, якія ёсьць у асобных раёнах, як простую барацьбу супроць плянаў і нежаданьне мабілізаваць масы на іх выкананьне. Павінна быць разгорнута самая бязьлітасная барацьба з імкненьнямі скараціць пляны, асабліва за кошт тэхнічных культур і асваеньня новых земляў, з самацёкам у мабілізацыі другарадных культур.

Пленум абавязвае райкомы неадкладна выконваць нарады Наркамзему на перакідку пасеньня.

3. Рамонт трактараў і с.-г. машын, збор тары і рамонт, загрузку ўсёй наяўнай тары гаручым скончыць да 10-га красавіка. Узьняць адказнасьць майстэрань за якасьць праведзенага рамонту. Ад ступені адрамантаванасьці трактараў, падрыхтаванасьці каня і поўнай ліквідацыі абязьлічкі будзе залежаць вырашэньне карэннага пытаньня ці здолее саўгас, калгас і МТС з посьпехам змагацца за высокі ўраджай, ці здолее засеяць палі ў самы кароткі тэрмін. У дэкады тэрмін прасунуць усе с.-г. машыны і інвэнтар, якія ёсьць на складах у саўгасы і калгасы.

4. Пленум абавязвае ўсе партыйныя, савецкія і зямельна-калгасныя арганізацыі (збожжаачыстка і пратручваньне насеньня, вапнаваньне і тарфаваньне глебы, сваячасовая вывазка гною, завоз мінэральнага ўгнаеньня, збор попелу, раньняе ворыва і інш.).

Пленум завастрае асаблівую ўвагу ўсіх партарганізацый на абавязковае правядзеньне раньняй сяўбы, якая па вопыце быць скончана ў максымальна-скарочаны тэрмін (на працягу мая мес.), што мае вельмі важнае значэньне ў справе барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці.

На аснове правядзеньня ўсіх гэтых мерапрыемстваў у размерах, вызначаных пастановай ЦК і СНК БССР, дабіцца ўраджайнасьці з га па мэнш 2,6 цэнт. па ільнавалакне, 4 цэнтн. па канаплявалакне, 112 цэнт. па гародных культурах, па капусьніе і сене — 35 цэнтн., па вікавым сене — 33 цэнт., па збожжавых культурах — 9 цэнтн.

5. Агра-тэхніцы належыць выключная роля ў барацьбе за ўздым сацыялістычнай вытворчасьці на новую якасна вышэйшую ступень, што цесна зьвязана з найбольш поўным скарыстаньнем пераваг, якія дае буйнае сацыялістычнае зямляробства. Задачай партарганізацый у падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы зьяўляецца прыпыцце самых рашучых захадаў па ўкараненьні агратэхнікі ў саўгасы, МТС і калгасы, мабілізуючы па гэтую справу шырокія масы рабочых саўгасаў, МТС, калгасьнікаў і с. г. спэцыялістаў. Пленум лічыць абавязковым для ўсіх камуністаў і камсамольцаў аўладаньне агра-зоатэхнікай і тэхнікай калгаснай вытворчасьці. Паставіць цэнтральнай задачай перад усімі сельска-гаспадарчымі, навукова-даследчымі ўстановамі ўкараненьне ў шырокія масы рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў агратэхнікі і абавязаць Дзяржвыдавецтва напырыць выданьне папулярнай навукова-агратэхнічнай літаратуры, плякатаў і лістовак.

Пленум абавязвае ўсе партыйныя і савецкія арганізацыі забясьпечыць найбольш уважлівыя адносіны да с.-г. спэцыялістаў, рашуча змагацца з недаацэнкай і ігнараваньнем іх ролі. Необходна вызваліць сельска-гаспадарчых спэцыялістаў ад усялякай канцылярскай работы, не дапускаць іх выкарыстоўваньня не па спэцыяльнасьці, выкарыстоўваючы іх непасрэдна ў с.-г. вытворчасьці. С.-г. спэцыялісты павінны быць у першых радох барацьбітоў за высокі ўраджай, за ўкараненьне агратэхнікі.

6. Пленум указвае ўсім партарганізацыям па тое, што ў 1932 г. павінна быць створана ўласная кармовая база для разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Пасьпяховасьць стварэньня гэтай базы цалкам залежыць ад поўнага выкананьня пляну веснавой сяўбы і падрыхтаванасьці да ўборачнай кампаніі. Пленум абавязвае партыйныя арганізацыі забясьпечыць поўнае выкананьне пляну засеву кармовых траў, сіласаваньня і ўстанавіць самае жорсткае выдаткаваньне кармоў.

7. Пленум ЦК і ЦККК КП(б)Б абавязвае ўсе партыйныя, савецкія і калгасныя арганізацыі забясьпечыць паўхільнае выкананьне наступнай пастановы ЦК УсеКП(б) ад 26-га сакавіка: «У радзе раёнаў назіраецца практыка аграмаджаньня кароў і дробнай жывёлы ў паасобных калгасьнікаў фактычна прымусовымі спосабамі, што самым грубым чынам парушае неаднаразовыя ўказаньні Цэнтральнага Камітэту партыі і статут сельска-гаспадарчай арцелі. Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае, што толькі ворагі калгасаў могуць дапускаць прымусовае аграмаджаньне кароў і дробнай жывёлы ў паасобных калгасьнікаў. Цэнтральны Камітэт растлумачвае, што практыка прымусовага адбіраньня ў калгасьнікаў кароў і дробнай жывёлы ня мае нічога агульнага з палітыкай партыі. Задача партыі заключаецца ў тым, каб у кожнага калгасьніка была свая карова, дробная жывёла, птушка. Далейшае папярэньне і разьвіцьцё калгасных фэрм павінна ісьці толькі шляхам гадоўлі фэрмамі маладняка, або куплі імі жывёлы. Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) прапануе ўсім партыйным, савецкім і калгасным арганізацыям:

а) Спыніць усякія спробы прымусовага аграмаджаньня кароў і дробнай жывёлы ў калгасьнікаў, а вінаватых у парушэньні дырэктывы ЦК выключаць з партыі;

б) арганізаваць дапамогу і садзейнасьць калгасьнікам, якія ня маюць каровы або дробнай жывёлы, у куплі і гадоўлі маладняка для асабістых патрэб».

Пленум даручае бюро ЦК і прэзыдыуму ЦККК КП(б)Б у дэкады тэрмін рас працаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні данай пастановы ЦК УсеКП(б).

8. У мэтах стварэньня пасенных фондаў пленум ЦК і ЦККК абавязвае НКЗ, ГК і РК пры правядзеньні веснавой сяўбы 1932 году забясьпечыць поўны засеў плошчы пад пасеньнікамі бобовых, збожжавых і кармовых культур.

9. У веснавой сяўбе МТС павінна паставіць у цэнтры сваёй увагі барацьбу за якасьць сельска-гаспадарчай вытворчасьці і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Работу МТС партыя будзе ацэньваць па выніках ураджайнасьці і павышэньні таварнасьці абслугоўваемых імі калгасаў па выкананьні гэтымі калгасамі ...ці (збожжаачыстка і пратручваньне насеньня, вапнаваньне і тарфаваньне глебы, сваячасовая вывазка гною, завоз мінэральнага ўгнаеньня, збор попелу, раньняе ворыва і інш.).

Пленум завастрае асаблівую ўвагу ўсіх партарганізацый на абавязковае правядзеньне раньняй сяўбы, якая па вопыце быць скончана ў максымальна-скарочаны тэрмін (на працягу мая мес.), што мае вельмі важнае значэньне ў справе барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці.

На аснове правядзеньня ўсіх гэтых мерапрыемстваў у размерах, вызначаных пастановай ЦК і СНК БССР, дабіцца ўраджайнасьці з га па мэнш 2,6 цэнт. па ільнавалакне, 4 цэнтн. па канаплявалакне, 112 цэнт. па гародных культурах, па капусьніе і сене — 35 цэнтн., па вікавым сене — 33 цэнт., па збожжавых культурах — 9 цэнтн.

5. Агра-тэхніцы належыць выключная роля ў барацьбе за ўздым сацыялістычнай вытворчасьці на новую якасна вышэйшую ступень, што цесна зьвязана з найбольш поўным скарыстаньнем пераваг, якія дае буйнае сацыялістычнае зямляробства. Задачай партарганізацый у падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы зьяўляецца прыпыцце самых рашучых захадаў па ўкараненьні агратэхнікі ў саўгасы, МТС і калгасы, мабілізуючы па гэтую справу шырокія масы рабочых саўгасаў, МТС, калгасьнікаў і с. г. спэцыялістаў. Пленум лічыць абавязковым для ўсіх камуністаў і камсамольцаў аўладаньне агра-зоатэхнікай і тэхнікай калгаснай вытворчасьці. Паставіць цэнтральнай задачай перад усімі сельска-гаспадарчымі, навукова-даследчымі ўстановамі ўкараненьне ў шырокія масы рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў агратэхнікі і абавязаць Дзяржвыдавецтва напырыць выданьне папулярнай навукова-агратэхнічнай літаратуры, плякатаў і лістовак.

Пленум абавязвае ўсе партыйныя і савецкія арганізацыі забясьпечыць найбольш уважлівыя адносіны да с.-г. спэцыялістаў, рашуча змагацца з недаацэнкай і ігнараваньнем іх ролі. Необходна вызваліць сельска-гаспадарчых спэцыялістаў ад усялякай канцылярскай работы, не дапускаць іх выкарыстоўваньня не па спэцыяльнасьці, выкарыстоўваючы іх непасрэдна ў с.-г. вытворчасьці. С.-г. спэцыялісты павінны быць у першых радох барацьбітоў за высокі ўраджай, за ўкараненьне агратэхнікі.

6. Пленум указвае ўсім партарганізацыям па тое, што ў 1932 г. павінна быць створана ўласная кармовая база для разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Пасьпяховасьць стварэньня гэтай базы цалкам залежыць ад поўнага выкананьня пляну веснавой сяўбы і падрыхтаванасьці да ўборачнай кампаніі. Пленум абавязвае партыйныя арганізацыі забясьпечыць поўнае выкананьне пляну засеву кармовых траў, сіласаваньня і ўстанавіць самае жорсткае выдаткаваньне кармоў.

7. Пленум ЦК і ЦККК КП(б)Б абавязвае ўсе партыйныя, савецкія і калгасныя арганізацыі забясьпечыць паўхільнае выкананьне наступнай пастановы ЦК УсеКП(б) ад 26-га сакавіка: «У радзе раёнаў назіраецца практыка аграмаджаньня кароў і дробнай жывёлы ў паасобных калгасьнікаў фактычна прымусовымі спосабамі, што самым грубым чынам парушае неаднаразовыя ўказаньні Цэнтральнага Камітэту партыі і статут сельска-гаспадарчай арцелі. Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае, што толькі ворагі калгасаў могуць дапускаць прымусовае аграмаджаньне кароў і дробнай жывёлы ў паасобных калгасьнікаў. Цэнтральны Камітэт растлумачвае, што практыка прымусовага адбіраньня ў калгасьнікаў кароў і дробнай жывёлы ня мае нічога агульнага з палітыкай партыі. Задача партыі заключаецца ў тым, каб у кожнага калгасьніка была свая карова, дробная жывёла, птушка. Далейшае папярэньне і разьвіцьцё калгасных фэрм павінна ісьці толькі шляхам гадоўлі фэрмамі маладняка, або куплі імі жывёлы. Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) прапануе ўсім партыйным, савецкім і калгасным арганізацыям:

а) Спыніць усякія спробы прымусовага аграмаджаньня кароў і дробнай жывёлы ў калгасьнікаў, а вінаватых у парушэньні дырэктывы ЦК выключаць з партыі;

б) арганізаваць дапамогу і садзейнасьць калгасьнікам, якія ня маюць каровы або дробнай жывёлы, у куплі і гадоўлі маладняка для асабістых патрэб».

Пленум даручае бюро ЦК і прэзыдыуму ЦККК КП(б)Б у дэкады тэрмін рас працаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні данай пастановы ЦК УсеКП(б).

8. У мэтах стварэньня пасенных фондаў пленум ЦК і ЦККК абавязвае НКЗ, ГК і РК пры правядзеньні веснавой сяўбы 1932 году забясьпечыць поўны засеў плошчы пад пасеньнікамі бобовых, збожжавых і кармовых культур.

9. У веснавой сяўбе МТС павінна паставіць у цэнтры сваёй увагі барацьбу за якасьць сельска-гаспадарчай вытворчасьці і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Работу МТС партыя будзе ацэньваць па выніках ураджайнасьці і павышэньні таварнасьці абслугоўваемых імі калгасаў па выкананьні гэтымі калгасамі ...пая кампанія, апаросная і ацёлачная, па якія павінна быць зьвернута значная ўвага партарганізацыяй.

Пленум прапануе партарганізацыям арганізаваць выкананьне пляну веснавой сяўбы шляхам разгортваньня шырокай масавай работы, у прыватнасьці, значна ўзмацніць работу сярод працоўных жанчын праз делегацкія сходы, палітасьветныя ўстановы і інш.

19. Цэнтральны, раённы і нізавы друк павінен стаць ініцыятарам у прыстасаваньні агра-тэхнікі на саўгасных і калгасных палёх. Праз друк партарганізацыі павінны ўзьняць шырокія масы рабочых саўгасаў, МТС, калгасьнікаў, бедняко́ў і серадняко́ў—аднаасобнікаў на барацьбу за высокі ўраджай, за мабілізацыю пасеньня, рамонт інвэнтару, падрыхтоўку цягавай сілы і правядзеньне інш. мерапрыемстваў, за падрыхтоўку ўборкі ўраджаю.

Побач з выяўленьнем недахопаў у рабоце па падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы ў рабоце, сельсавеце, саўгасе, МТС, калгасе, необходна шырока асьвятляць лепшы вопыт работы, перамогі гэты вопыт ва ўсе саўгасы, калгасы, МТС, сельсаветы. Шырока разгарнуць заключэньне сац. дагавароў паміж асобнымі раёнамі, калгасамі, МТС і саўгасамі.

20. Поўнае і правільнае скарыстаньне жаночай рабсілы ў калгасах магчыма пры выстарчальным разгортваньні бытавых установ (дзіц. пляцоўкі, яслі), у сувязі з гэтым пленум абавязвае Наркамаховы здароўя, Наркамасьветы, ГК і РК забясьпечыць не пазьней 5/V разгортваньне вызначанай сеткі дзіцячых пляцовак, яслей і інш. бытавых установ.

Разам з тым пленум ЦК і ЦККК абавязвае Белкаапсаюз, саўгастрэсты і Белкалгаспэнтр разгарнуць работу па арганізацыі грамадзкага харчаваньня на час пасеўнай кампаніі.

21. Усім саўгасам, МТС, калгасам, раённым арганізацыям прыступіць да правядзеньня з 1-га па 15-га красавіка генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы, правяраючы ня толькі колькасную падрыхтаванасьць, але і якасную, агледзець кожную машыну, яе спраўнасьць, рашуча выкрываючы «очковтирательство». Праверка павінна мабілізаваць шырокія калгасныя масы на барацьбу за якасьць, за раньняе скончаньне сяўбы в тым, каб арганізавана выйсьці ў поле, равей сяўбу скончыць і вызваліць хутчэй людзкія і цягавыя рэсурсы на выкананьне іншых важнейшых работ, з тым, каб завербаваць сотні тысяч ударнікаў 3-яй бальшавіцкай вясны. Праверка, праведзеная масамі, павінна яшчэ больш павысіць палітычную і вытворчую актыўнасьць рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў, шчыльней згуртаваць іх вакол партыі і, пад яе кіраўніцтвам, дабіцца пераможнага завяршэньня веснавой сяўбы, забясьпечыўшы высокі ўраджай.

22. Пленум падкрэсьлівае, што апаратыйнае кіраўніцтва сяўбой можа быць забясьпечана толькі пры ўмове рашучай перабудовы і ўмацаваньня партыйна-масавай работы на вёсцы.

Пленум прапануе ГК і РК безадкладна ўмацаваць пізавую партячэйку ў МТС, саўгасах, калгасах, прадпрыемствах і вёсках, перабудаваць работу апорных ячэек, забясьпечыўшы высокі ўраджай.

Пленум падкрэсьлівае, што ініцыятыва ...ных важнейшых работ, з тым, каб завербаваць сотні тысяч ударнікаў 3-яй бальшавіцкай вясны. Праверка, праведзеная масамі, павінна яшчэ больш павысіць палітычную і вытворчую актыўнасьць рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў, шчыльней згуртаваць іх вакол партыі і, пад яе кіраўніцтвам, дабіцца пераможнага завяршэньня веснавой сяўбы, забясьпечыўшы высокі ўраджай.

22. Пленум падкрэсьлівае, што апаратыйнае кіраўніцтва сяўбой можа быць забясьпечана толькі пры ўмове рашучай перабудовы і ўмацаваньня партыйна-масавай работы на вёсцы.

Пленум прапануе ГК і РК безадкладна ўмацаваць пізавую партячэйку ў МТС, саўгасах, калгасах, прадпрыемствах і вёсках, перабудаваць работу апорных ячэек, забясьпечыўшы, інструктаваньне і жыву дапамогу пізавой ячэйцы з боку ГК і РК і апорных ячэек, правільна расставіць камуністаў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на ўмацаваньне партыйнага ўплыву на ўсіх важнейшых участках сельска-гаспадарчай вытворчасьці (фэрме, скотным двары, свінарніку, калгасным брыгадах, трактарнай калёне і г. д.)

Важнейшай задачай усіх партарганізацый у вёсцы зьяўляецца павышэньне арганізатарскай і кіруючай ролі камуністаў і камсамольцаў, якія павінны пагалоўна быць ударнікамі ня толькі самі, але і арганізатарамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод рабочых МТС, саўгасаў і калгасаў.

23. Падрыхтоўка і правядзеньне сяўбы сустрэне шалёнае супраціўленьне клясавага ворага і яго агентуры ўнутры партыі. Кулацтва ўсю энэргію накіроўвае на тое, каб падарваць справу арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, стварэньня брыгад, як асноўнага зьвяна калгаснай вытворчасьці, нацкоўвае адсталых калгасьнікаў на перадавых ударнікаў-актывістаў, супроць укараненьня новай тэхнікі, агратэхнікі ў калгасы. У радзе выпадкаў клясавы вораг не сустракае рашучага адпору, нават з боку партыйных арганізацый. Пленум падкрэсьлівае, што задачы трэцяй бальшавіцкай вясны могуць быць выкананы толькі ў рашучай барацьбе з клясавым ворагам, у прыватнасьці, пры ўмове рашучай ачысткі калгасаў ад кулацка-варожых элемэнтаў, у барацьбе з агентурай клясавага ворага—правымі і «левымі» апартуністамі і з прыміраньцтвам да ўхілаў ад лініі партыі.

ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ ДА СЯЎБЫ

ДАВЯДЗЕНЬНЕМ ВЫТВОРЧЫХ ЗАДАНЬНЯЎ ДА БРЫГАД, СКАНЧЭНЬНЕМ ССЫПКІ НАСЕНЬНЯ—

ПЕРАДАВЫЯ САЎГАСЫ І КАЛГАСЫ ДЭМАНСТРУЮЦЬ СВАЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ ДА ВЫХАДУ У ПОЛЕ

УСІМ РАЙКОМАМ КП(б)Б

Абвешчаная ЦКК-НК РСІ, Наркамземам, Калгасцэнтрам і рэдакцыяй газ. «Зьвязда» масавая генэральная праверка падрыхтаванасьці да сяўбы на аснове пастановы сакавіцкага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦККК КП(б)Б павінна мабілізаваць шырокія колы рабочых МТС, саўгасаў, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкія масы аднаасобнікаў на барацьбу за якасьць с.-г. вытворчасьці, за пасьпяховае правядзеньне рамонту с.-г. машын, скончаньне ссыпкі насеньня, за падрыхтоўку да сяўбы аднаасобнага сэктару, павышэньне ўраджайнасьці, раньняе скончаньне сяўбы.

У часе праверкі трэба завербаваць сотні тысяч ударнікаў трэцяй бальшавіцкай вясны, барацьбітоў за поўнае выкананьне с.-г. пляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Прапануецца ўсім раённым партарганізацыям неадкладна ўключыцца ў генэральную праверку.

Мабілізуйце ўвесь актыў, уключэце раённы і нізавы друк, забясьпечце самаправерку ў кожным саўгасе, калгасе, МТС і паселішчы.

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

Кожная брыгада атрымала вытворчае заданьне

РАГАЧОЎ.

На аснове пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага, буйнейшы калгас раёну імя Сьвярдлова поўнасьцю скончыў падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

Пасеньня і страхавыя фонды ссыпаны ў разьмерах, якія забясьпечваюць засеў вызначанай плошчы пад яравымі культурамі.

Збожжавых культур ссыпана 410.2 цнт., тэхнічных і сіласных культур (разам) — 60,8 цнт., бульбы — 3.204 цнт., насеньня траў — 83 цнт. і гародніны — 1,2 цнт.

Сельска-гаспадарчыя машыны і інвэнтар адрамантаваны і прыведзены ў баявую гатоўнасьць. Асаблівая ўвага зьвернута на падрыхтоўку конскай цягавай сілы. Калгас мае 180 рабочых коняй, у догледзе якіх поўнасьцю ліквідавана абязьлічка. На час сяўбы для рабочых коняй створан браніраваны фуражны фонд з 172 цнт. канцэнтраваных кармоў, 79 цнт. сена, і 130 цнт. сакавітых кармоў.

Уся рабочая сіла калгасу ў колькасьці 223 чалавек разьбіта на 9 вытворчых брыгад: 4 паляводчыя брыгады з агульнай колькасьцю 151 калгасьнікаў, 2 — жывёлагадоўчыя (адна па абслугоўваньні СТФ, другая — МТФ), адна брыгада садоваагародная, адна — будаўнічая (сэзонная) і адна па працы на дапаможных прадпрыемствах (млыны, крупадзёрка, кузьня). Брыгадзірамі вылучаны лепшыя ўдарнікі. Да кожнай брыгады прымацаван адпаведны інвэнтар, машыны, прылады, коні. Кожнай брыгадзе дано вытворчае заданьне.

Так, паляводчай брыгадзе № 1 у колькасьці 50 чалавек, на чале якой стаіць лепшы калгасьнік-ударнік тав. **Гулянкоў** дано паступнае заданьне: засеяць, убраць і абмалаціць ільну 25 га, бульбы — 150 га, жыта на выпас для СТФ — 10 га, вікі на выпас — 17,5 га, грэчкі — 5 га. Убраць азімае жыта на 173 га і столькі - ж узараць пад зяб. Забясьпечыць ураджайнасьць з гэктару па ніжэй: бульбы — 125 цнт., ільну-пасеньня — 5 цнт., трасты — 29 цнт., зялёнай травы — 100 цнт., і жыта — 8,5 цнт. (Белта).

Паляводчая брыгада забясьпечыла ссыпку насенных фондаў

Калгас «Чырвоны арэт», Ратамскага сельсавету, Менскага раёну, сустракае веснавую сяўбу.

Дзякуючы энэргічнай рабоце праўленьня, якое здолела мабілізаваць ініцыятыву калгасьнікаў, насенны і страхавы фонд ссыпаны поўнасьцю. Інвэнтар адрамантаваны. Насеньне ачышчана і адсартавана. Створан кармовы фонд на час палявых работ у разьмеры 83 цнт. сена і звыш 3 цнт. аўса.

У калгасе арганізаваны 4 спэцыялізаваныя брыгады. Паляводчая брыгада, якая атрымала вытворчае заданьне, шляхам мабілізацыі ўнутраных пасенных рэсурсаў калгасу забясьпечыла сваячасовую ссыпку пасенных і страхавых фондаў. Жывёла калгасу знаходзіцца ў добрым стане.

Дзякуючы правільнай расстаноўцы рабочай сілы, калгас штодзенна вылучае лішнія рабочыя рукі для дапамогі суседняму саўгасу імя **Карла Лібкнэхта**. Заданьне па вывазцы лесу і каменьня калгасам выканана на 122 проц.

5 красавіка калгас арганізуе пробны выхад у поле для таго, каб канчаткова праверыць усе галіны гаспадаркі і замацаваць дасягнутыя посьпехі ў падрыхтоўцы да трэцяй бальшавіцкай вясны.

М.

Праверылі сваю гатоўнасьць

ХОЙНІКІ. Саўгас «Стрэлічаў» разам з падшэфным калгасам «Пралетары» 24 сакавіка праверылі сваю падрыхтаванасьць да сяўбы пробным выездам у поле. Саўгас і калгас выехалі ...стасаваных для гэтага памяшканьняў.

Складзены вытворчыя брыгады, якім вызначаны поўныя вучасткі работы.

Для аўладаньня тэхнікай сельскай ...

Да адказнасьці „очковтирателей"

ВУШАЧЫ. Жарскі сельсавет да гэтага часу лічыў не давёў пасеўных плянаў да ўсіх паселішч. З 16 паселішч атрымалі пляны толькі 6.

Паасобныя праўленьні калгасаў скарачаюць пляны пасеву. Напрыклад, калгас імя VI зьезду саветаў скараціў плян пасеўнай плошчы на 39 проц., калгас «Паляводз» — на 50 проц. Сельсавет зусім не рэагуе на гэтыя апартуністычныя спробы скараціць пасеўную плошчу.

У галіне забясьпячэньня пасеўнай плошчы насеньнем сельсавет апрача дачы няправільных вестак раёну нічога ня робіць. 2 сакаві

Партыйнае будаўніцтва

ЦЬВЁРДАЕ І ПАСЬЛЯДОУНАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ—

адна з важнейшых задач у практычным ажыцьцяўленьні ленінскай нацпалітыкі

Больш клясавай пільнасьці

У агульнай сыстэме практычнай работы па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, беларусізацыя ва ўмовах нашай рэспублікі зьяўляецца адным з важнейшых зьвеньняў.

Беларусізацыя дзяржаўнага апарату, гаспадарчых, кааперацыйных, навучальных і іншых устаноў, іх умацаваньне за лік лепшых бальшавіцкіх, пралетарскіх кадраў з беларусаў, аўладаньне самымі шырокамі масамі чле наў партыі беларускай мовай—неабходная ўмова пасьпяховага будаўніцтва пралетарскай па зьмесьце і нацыянальнай па форме культуры. Гэтыя мерапрыемствы зьяўляюцца неабходнымі для актыўнага ўдзелу ў нацыянальна-культурным будаўніцтве найшырэйшых пралетарскіх і працоўных мас.

Узмоцненае разгортваньне беларусізацыі, абслугоўваньне нацыянальных меншасьцяй на іх роднай мове, сыстэматычная работа па інтэрнацыянальным выхаваньні мас забясьпечваюць ліквідацыю рэшткаў нацыяналістычных перажыткаў і пасьпяховую барацьбу з праяўленьнямі шавінізму, якія зьяўляюцца простым адлюстраваньнем супраціўленьня клясава-варожых элементаў разгорнутаму сацыялістычнаму наступленьню.

Між тым, некаторыя мясцовыя арганізацыі слаба яшчэ змагаюцца за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі. У радзе месц нагляда ецца фармальны, дзяляцкі падыход да правядзеньня беларусізацыі, а таксама ныцадкі пасыўнага і актыўнага супраціўленьня ажыцьцяўленьню гэтай важнейшай палітычнай задачы.

Беларусізацыя часта зводзіцца толькі да аўладаньня мовай. Выпускаюцца з-пад увагі пытаньні каранізацыі, вывучэньня гісторыі і эканомікі Беларусі і інш. Напрыклад, на-

У Гомельскім дасьледчым інстытуце

Абураючая няпісьменнасьць і зьбіццэжанасьць, а часта — нічым не прыкрыты вялікадзяржаўны шавінізм характарызуюць сабой адказы супрацоўнікаў **Гомельскага** дзяржаўнага **дасьледчага** інстытуту на запытаньні камісіі па праверцы беларусізацыі.

— Што такое «нацдэмаўшчына»? —пытае ўдзельнік камісіі супрацоўніку інстытуту В'юшкову.

— Нацдэмаўшчына... — моршчыць лоб В'юшкова, быццам стараецца нешта ўспомніць — нацдэмаўшчына, гэта... у складзе Савецкага Саюзу такая... аўтаномная рэспубліка.

Зусім не такое ўяўленьне аб агентуры польскіх нацыянал - фашыстаў мае работнік дасьледчага інстытуту Магільніцкі. Ён, адказваючы на гэта-ж пытаньне, між іншым дадае:

— Нацдэмаўшчына зараз ужо ліквідавана, а таму больш яна небясьпекай не зьяўляецца.

Такі антыміністычны адказ Магільніцкага, яго бясьпечная ацэнка клясавай барацьбы ў нацыянальным пытаньні можа задаволіць людзей толькі з лягеру наўзучага шавінізму і нацыяналізму, людзей, якія найменшае прытушленьне клясавай пільнасьці скарыстоўваюць для таго, каб узьвіць галаву, пашкодзіць ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі.

У адказах раду іншых супрацоўнікоў інстытуту (Бабчына, Белавусаў і інш.) палітычная няпісьменнасьць набывае яшчэ больш шкодны характар. Яны імкнуцца пераканаць, што «яўрэйскім шавіністам зьяўляецца той, хто гаворыць на яўрэйскай мове». Ужываньне-ж выключна расійскай мовы, ігнараваньне дырэктыў партыі аб беларусізацыі не расцэньваюцца імі, як праяўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму. Яны, бачыце, лічаць, што «зараз вялікадзяржаўнага шавінізму няма і быць ня можа, бо ён мог быць выключна ў царскай Расіі». Наўрад ці трэба даводзіць клясавую варожасьць падобнага разважаньня.

Так «арыентуюцца» ў пытаньнях нацыянальнай палітыкі супрацоўнікі і нават навуковыя работнікі дзяржаўнай навукова-дасьледчай установы.

Некаторыя з іх сумленна прызнаюцца:

— Мы ня ведаем беларускай мовы таму, што ня чытаем беларускай літаратуры.

І толькі? Наўрад ці толькі беларуская літаратура ня чытаецца гэтымі супрацоўнікамі інстытуту. Не падлягае сумненьню, што яны ня чытаюць і пастаноў партыі аб нацыянальным пытаньні, а калі і чыталі, дык сабатуюць іх ажыцьцяўленьне.

Сялоў.

Вялікадзяржаўны шавініст пад аховай дырэкцыі інстытуту

Партыйная арганізацыя водна-мэліярацыйнага інстытуту (Горкі) невыстарчальна змагаецца за практычнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі. Інтэрнацыянальная выхаваўчая работа сярод студэнтаў не праводзіцца. За ўвесь час існаваньня гэтай навучальнай установы, у ёй ня было праведзена ні аднаго масавага вечара, прысьвечанага абмеркаваньню пытаньняў нацыянальнай палітыкі.

Дырэктывы партыі аб беларусізацыі кіраўніцтвам інстытуту ігнаруюцца. Кіраўніцтва партыйнай арганізацыі інстытуту замест таго, каб разгарнуць сярод студэнтаў інтэрнацыянальна-выхаваўчую работу, арганізаваць гурткі па вывучэньні культуры і эканомікі Беларусі, прыцягнуўшы да ўдзелу ў іх навуковых работнікаў, прымірэнча адносіцца да факту скажэньня нацыянальнай палітыкі партыі.

Выкарыстоўваючы бязьдзейнасьць партыйнай арганізацыі ў гэтым напрамку, рад студэнтаў адмаўляецца вывучаць беларускую мову і карыстацца ёю. Студэнтка **Ляско** (3-ці курс асушэньня) на агульным сходзе заяўляе, што «ў нашай групе няма належных умоў для таго, каб гаварыць на беларускай мове».

Сын заможніка—студэнт 1-га курсу водазабесьпячэньня — **Берасьцень** дэманстрацыйна адмаўляецца адказваць на беларускай мове. Калі яму робяць заўвагу, ён адказвае: «Аб гэтым пагаворым пасьля». А «пасьля» Берасьцень заяўляе, што «нас прымушаюць гаварыць па-беларуску, але мяне прымусіць ня здолеюць».

Агульны сход студэнтаў патрабаваў выключэньня з інстытуту Берасьценя, як махровага вялікадзяржаўніка, простага выканаўцы сацыяльнага заказу клясавага ворага. Аднак, дырэкцыя інстытуту да гэтага часу патрабаваньне студэнцкага калектыву чамусьці не адмаўляецца рэалізаваць. А між тым уся грамадзкасьць інстытуту ведае, што варожыя настроі праяўляліся ў Берасьцені ня толькі ў выглядзе вялікадзяржаўніцкіх выступленьняў. Яго клясава-варожыя погляды на савецкую ўладу і савецкіх спэцыялістаў, выяўлены ў радзе яго-ж выступленьняў.

А—р.

Правяралі па сшытках

На працягу бягучага навучальнага году ў **Магілёўскім** дарожна-будаўнічым тэхнікуме было некалькі выпадкаў праяўленьня антысэмітызму і вялікадзяржаўнага шавінізму. За клясава-варожыя выступленьні супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі з тэхнікуму выключана 5 студэнтаў. Беларусізацыя праводзіцца слаба. Большасьць дысцыплін выкладаецца на расійскай мове.

У тэхнікуме да гэтага часу праверка беларусізацыі фактычна не праводзілася. Камісія, якой была даручана гэта работа, зразумела свае абавязкі вельмі прымітыўна. **Яна абмежавалася тым, што правярала ў некаторых студэнтаў сшыткі і на гэтым сваю работу СПЫНІЛА.** Кіраўніцтва тэхнікуму таксама лічыць праверку скончанай.

Партарганізацыя тэхнікуму павінна неадкладна выправіць дапушчаную памылку, глыбока праверыць ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб беларусізацыі, шырока разгарнуць работу па вывучэньні культуры і эканомікі Беларусі і інтэрнацыянальным выхаваньні.

Гінбарг.

Супраціўленцы беларусізацыі не сустракаюць адпору

У радзе ўстаноў і прадпрыемстваў Сіроцінскага раёну беларусізацыя ігнаруецца. Больш за ўсё гэта праяўляецца на пошце, чыгунцы, у леспрамгасе і МТС. Работнікі пошты прынятыя тэлеграмы пераводзяць на расійскую мову.

Ня лепш адносіцца да беларускай мовы і леспрамгас. Усе леспрамгасаўскія справы вядуцца выключна на расійскай мове. Аналёгічнае становішча мае месца на чыгунцы, дзе нават лёзунгі, абвесткі і г. д. зьяўляюцца сьведкамі таго, што кіраўніцтва чыгуначнай станцыі ігнаруе дырэктывы партыі аб беларусізацыі.

Аграном МТС тав. Савік, ня гледзячы на тое, што ён добра аўладае беларускай мовай ніколі яе ня ўжывае. Гэта Савік тлумачыць тым, што беларуская мова яму не падабаецца.

Усё гэта адбываецца на вачох у партыйных ячэек гэтых устаноў і прадпрыемстваў. Але барацьбы з супраціўленцамі беларусізацыі не праводзіцца.

П. Харытановіч.

„Апэрацыйнае кіраўніцтва" Капыльскага райкалгассаюзу

КАПЫЛЬ. Агульны плян ссыпкі насеньня выкананы па раёне толькі на 65,8 проц. у тым ліку збожжавых культур — 79,2 проц., тэхнічных — 55,7 проц., бульбы — 64,5 проц. На Вялепынскім, Браткаўскім, Капыльскім, Прускім і Цімкаўскім сельсаветах выкананьне пляну ссыпкі насеньня фондаў не перавышае 30 проц.

Аблігацыі насеннай пазыкі імя конкурсу «Правды» распаўсюджваюцца толькі рэдакцыяй газэты «Калгаснік Капыльшчыны». З боку-ж зямельна-калгасных органаў раёну ў гэтай галіне нічога ня робіцца.

Апэрацыйнае кіраўніцтва падрыхтоўкай да сяўбы з боку райза і райкалгассаюзу адсутнічае. Так, паводле дырэктыў райкалгассаюзу, калгасы «Прамень свабоды» і «Камунар» павінны забараніваць насеньне бульбы на 100 га кожны. Між тым выявілася, што гэтым калгасам патробна насеньня фактычна на 170 га. Зараз гэтыя калгасы адгружаюць недахват насеньня бульбы. (Белта).

Месячнік дапамогі дарожнаму будаўніцтву

Выканана толькі 40 проц. штурмавога заданьня

Падзесяцярыць тэмпы загатовак дарбудматар'ялаў, да 10 красавіка выканаць плян

Сьледаваць прыкладу Дрысеншчыны

31 сакавіка адбылося чарговае пасяджэньне цэнтральнага штабу пры ЦК КП(б)Б па кіраўніцтве месячніком дапамогі дарожнаму будаўніцтву. Начальнік Галоўдартрансу т. Фрумкін зрабіў інфармацыю аб ходзе месячніка. Да 25 сакавіка плян вывазкі каменю выканаў толькі на 40 проц. Па-ранейшаму вусім нізканы процант выхаду фурманак. Толькі ў апошнія дні пагыдаецца па радзе раёнаў (Бягомльскі, Віцебскі) некаторы зрух. Аднак, ён яшчэ не забясьпечвае поўнага і свайчасовага выкананьня пляну. Талачынскі раён, які ўвесь час дрэнна выконваў заданьне, у апошнюю пяціцідзёўку нават даў зьніжэньне выхаду фурманак — 22 проц. патрэбнай колькасьці.

За 8-ю пяціцідзёўку штурма па **Рэчыцкім** раёне сярэдні штодзенны выхад фурманак складае 4% да патрэбнай колькасьці; **Полацкі**—8 %, **Смалявіцкі** — 10 проц., **Асіпавіцкі**, **Бешанковіцкі** — 12 проц., **Лепельскі** — 16% і г. д. Вывазка каменю ідзе асабліва дрэнна па трэцім дарбудвучастку (на 25 сакавіка 7 проц. штурмавога заданьня, па 4-м і 5-м — 12 проц.

Толькі атэм **Дрысенскі раён выканаў заданьне па вывазцы каменю на 100 проц.** Горш за ўсіх вызонвае заданьне **Менскі** раён. Ён яшчэ і да гэтага часу, ня гледзячы на абавязкальствы гарсавету, усё яшчэ застаецца ў апошніх радах па выкананьні заданьня. Замест 2.000 фурманак што дзенна выходзіць 195. Падзвычай дрэнна з загатоўкай дарбудматар'ялаў.

Як высьветлілася са спрэчак, конскі і аўтатранспарт дарожных вучасткаў скарыстоўваецца пляўпасьцю. Конкі загружаны толькі на 55 проц. Працуцьцыйнасьць працы зусім невыстарчальная. З 24 кампрэсарабілаў працуе ўсяго 20 і то бяз поўнай нагрузкі.

Штаб пастанавіў давесьці да ведама ЦК КП(б)Б аб тым, што Менскі Гарсавет і штаб па правядзеньні месячніка ігнаруюць пастановы па пытаньні дарожнага будаўніцтва.

За ўдарную работу штаб пастанавіў прэміраваць сакратара Дрэсенскага райкому КП(б)Б тав. **Шоламава**, сакратара райкому камсамолу і старшыню райвыканкому тав. **Орсіка** — скуранымі гарнітурамі. Тысяча рублёў адпушчана раёну для індывідуальнага прэміраваньня лепшых ударнікаў дарожнага будаўніцтва (старшынь сельсаветаў, калгасаў і пазасобных рабочых). Апрача таго для прэміраваньня лепшых калгасаў, якія паказалі ўзоры барацьбы за загатоўку і вывазку дарбудматар'ялаў, выдзелена 10 пазовак. Неабходна адзначыць, што раённая газэта правяла вялікую работу па забясьпячэньні посьпеху месячніка. На папярэднім пасяджэньні штабу гэтага прэміравана ў суме 500 руб.

Трэба, каб прыкладу Дрысенскага раёну пасьледавалі ўсе раёны, якія адстаюць. Трэба, каб той нізкачны зрух, які зараз назіраецца ў радзе раёнаў, быў на многа раз узмоцнен, каб былі ўзяты сапраўды такія тэмпы, якія-б забясьпечылі своечасовае выкананьне штурмавога заданьня.

Апартуніст Скуньковаў злосна сабатуе работу

Партыйная і прафэсіянальная арганізацыі 5-га дарожна-будаўнічага вучастку яшчэ і зараз стаіць у баку ад месячніка дарожнага будаўніцтва. Работа зусім не перабудавана ў адпаведнасьці з 6 указаньнямі тав. Сталіна. Сапсіабарніцтва і ўдарніцтва адсутнічаюць. Ва ўсёй работе панае абязьлічка. Брыгадныя мэтады работы ня ўжываюцца. У выніку плян загатоўкі будаўнічага матар'ялу значна недавыкананы. На 20 сакавіка загатоўлена і вывезена толькі 11 проц. каменьня, пяску—2 проц. лесаматар'ялаў — 4 проц. Уласны транспарт скарыстоўваецца толькі на 20 проц.

На сёньняшні дзень з колькасьці 83 чалавек членаў саюзу толькі 7 абвясьцілі сябе ўдарнікамі. За ўвесь час не праведзена ніводнай выпрыбчай нарады. Старшыня прафэсіяналкі **Скуньковаў** злосна ігнаруе дырэктывы партыі і ўраду аб правядзеньні вызельнічыны, ліквідацыі абязьлічкі і інш. Ён заяўляе: «Я нічога не раблю таму, каб хутчэй сьнялі мяне з работы». Парт'ячэйка аб гэтым добра ведае і ніякіх мер ня прымае.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністах, якія зрываюць падрыхтоўку да будаўнічага сэзону.

Ал. Сіманоўскі, Верамейчык, Роскін.

Лепшыя брыгады 12 дарбудвучастка паказваюць узоры барацьбы за пляц

Агляд рабселькораўскіх лістоў

Пастанова ЦК КП(б)Б аб месячніку дарожнага будаўніцтва па радзе раёнаў рэалізуецца надзвычай павольнымі тэмпамі. Вось некалькі фактаў.

Горацкі раён,—піша селькор **Якубёнак**,—напаракор дырэктывам партыі і ўраду аб дарожнае будаўніцтве, бязьдзейнічае. Грамадзкасьць не мабілізавана. Загатоўка будаўнічых матар'ялаў зрываецца. **Гастадаўскі, Маслакоўскі, Кацялеўскі, Ленінскі, Горскі, Пакуцянскі** сельсаветы дагэтуль яшчэ зусім не прыступілі да загатовак будматар'ялаў. Дарэтаста **Тузаў** па Гастадаўскім сельсавеце адпо і везае, што складае акты. Больш ніякай работы не праводзіць.

На Цярэпіцкім сельсавеце для пабудовы маста патрэбна вывезьці 225 кбм. лесаматар'ялаў; вывезена-ж ня больш 60 кбм. Адзеленскі, Старабеліцкі і іншыя сельсаветы выканалі заданьне па загатоўцы будаўнічых матар'ялаў усяго на 10 проц. Ёсьць рад фактаў, калі ня вывезены будматар'ял разбазараецца (карэспандэнт **Казімірава**).

Кіраўніцтва 9-га дарбудвучастку не ўсвядоміла бальшавіцкай барацьбы за плян дарожнага будаўніцтва. Штодзённы выхад фурманак не перавышае 260, замест патрэбных 1.374. Уласны транспарт дарожных дыстанцый скарыстоўваецца на гэту справу ня больш, як на 30-40 проц.

Тав. **Сухарава** піша як 12-ты маршрутны дарвучастак па - баявому мабілізаваўся на выкананьне задач месячніка. Арганізавала 5 новых ударных брыгад. З брыгады зьнялі добраахвотна расцэнкі; адна на 10,8 проц.—Брыгада **Цярэшчанкі**—на 8,3 проц., брыгада **Пінчука**—на 8,3 проц. Увядзем штодзённы ўлік працы ўдарных брыгад, што дало магчымасьць значна павялічыць прадукцыйнасьць працы, дасягнута эканомія на 700 руб. Адарыт спэцыяльны куток ударніка. 13 сакавіка быў праведзен суботнік па загатоўцы дарбудматар'ялу. У суботніку прынялі ўдзел звыш тысячы фурманак.

Карэспандэнцыя з Капыльскага раёну селькора **А.** адзначае, што ў сувязі з неадвальняючым станавішчам з падрыхтоўкай да будаўнічага сэзону, Капыльскі райадзел Аўтадору абнасьціў сябе ўдарным і выклікам на спаборніцтва Слуцкі райадзел. Аўтадору па наступных пытаньнях сабраць 5.000 кбм. каменьня і вывезьці 500 кбм. за працягу месяца. У кожным калгасе, саўгасе, у кожным пасельніцтве шукаць арганізаваць ячэйкі Аўтадору. Арганізаваць месячныя курсы шофэраў з дапрыцяўжкаў на 30 чалавек. Правесьці 100 дакладаў і гутарак на тэму аб дарожным будаўніцтве.

Гэтыя пачынаньні павінны быць падхоплены ўсімі іншымі раёнамі.

КОЖНАМУ СЕЛЬСАВЕТУ, КАЛГАСУ—СУТАЧНЫЯ І ПЯЦІДЗЕННЫЯ ЗАДАНЬНІ СКАНЧЭНЬНЯ ПЕРААПРАЦОЎКІ І ЗДАЧЫ ІЛЬНАВАЛАКНА 58 проц.

На 26 сакавіка плян ільназагатовак па рэспубліцы выкананы на 58 проц. Прырост за пяціцідзёўку — 0,1 проц. Калгасы і МТС здалі 62,6 проц. пляну, іншыя калгасы — 80,6 проц., па адпасобным сэктарам загатоўлена 40,3 проц.

Рар раёнаў, нават ільнаводчых, яўна правальваюць загатоўкі. Так, Крупскі раён выканаў плян на 38,3 проц., Полацкі — на 45,3 проц., Вупшацкі — на 42,4 проц., Чашніцкі —45,9 проц. і г. д.

Паказаныя лібы сьведчаць аб тым, што тэмпы работы ня толькі зьнізіліся, але ў значнай частцы раёнаў ільназагатоўкі фактычна спыніліся.

Тольк махрова - апартуністычнай стаўкай на чарговасьць кампаній, поўнай дэмабілізацыі некаторых раённых і сельскіх арганізацый і ізадольнасьцю іх увязаць ільназагатоўкі з падрыхтоўкай да сяўбы можна тлумачыць тое, што за 5 дзён загатоўлена толькі 0,1 проц. пляну.

Бясспрэчна, што значная доля віны ляжыць на загатоўчым апараце, які ўсё яшчэ знаходзіцца ў стадыі «рэарганізацыі». Між тым рэарганізацыя «Загатільну» павінна была быць скончана яшчэ да 1-га сакавіка. Паводле дырэктывы ўраду у БССР павінна быць арганізавана 28 кантор «Загатільну», з якіх 18 міжраённых і 10 раённых. Яшчэ да гэтага часу ў некаторых раёнах (Асіпавічы) нават ня вызначаны ўчаўнаважаныя, апарат не ўкамплектаваны. Спажывецкая кааперацыя, не чакаючы арганізацыі кантор «Загатільну», спыніла загатоўкі, што зьяўляецца зусім няправільным і недапушчальным.

Спажывецкая кааперацыя не пайна ні ў якім разе аслабляць барацьбы за лён там, дзе яшчэ ня створан апарат «Загатільну». Сельскагаспадарчыя варыстоны абавязаны весьці загатоўкі да поўнага выкананьня пляну.

Важнейшым зьвяном у ходзе кампаніі зьяўляецца першачарговая перапрацоўка ільнатрасты. Наркамзем БССР даў зусім канкрэтныя ўказаньні. Перапрацоўка трасты павінна быць скончана не пазьней 15 красавіка. Кожнаму сельсавету, калгасу, вёсцы павінны быць даны дакладныя сутачныя заданьні. Адвучасова трэба арганізаваць падсушку, мяцьцё трасты асенняй і зімовай мочкі, а таксама ў бліжэйшыя-ж дні скончыць зімовы расьцёр сэмэны ільну. Пункты першачатковай апрацоўкі павінны быць пераведзены на кругласутачную работу. Гэтыя дырэктывы патрэбна безадкладна рэалізаваць.

У месячнік завяршэньня ільназагатовак, абвешчаны ОНК, неабходна мабілізаваць масы калгаснікаў і адпасобнікаў бедняцкіх і сярэдняцкіх — на поўную ліквідацыю запазычанасьці дзяржаве па тэхкультурах па пачатку сяўбы, на барацьбу з асушэньнем і разбазараньнем ільну.

На прыкладу Дрысы арганізаваць шырокую праверку выкананьня кантрактацыйных дагавароў.

Заваяваць канчатковую перамогу

ДРЫСА.

Да абвяшчэньня ўдарнага дэкадніка за 10 дзён па раёне паступіла ўсяго 10 цэнтн. трасты і ільнавалакна. ЗА ЧАС ДЭКАДНІКА ПАСТУПІЛА 386 ЦЭНТ. Агульны плян па адпасобным і калгасным сэктарох выкананы на 95 проц.

Найбольшую колькасьць ільну здаў Гагубоўскі сельсавет — 57,9 цэнтн. Каркапецкі — 52,0 цэнтн., Дзержавіцкі — 48 цэнтн. і Юзафаўскі — 44,7 цэнтн.

Адстаюць Расіцкі сельсавет, які на працягу дэкадніка здаў 12,5 цэнтн. Цястоўскі — 13,2 цэнтн. і Сардыцкі — 18,3 цэнтн.

Трэба адзначыць ударную работу пазасобных утаўнаважаных райкалгаспасаюзу і кааперацыйных карабейнікаў. Па Каркапецкім сельсавеце ўтаўнаважаным райкаспасаюзу тав. ГАРДЗІНЫМ быў праведзен рэйд, у часе якога загатоўлена 11 цэнтн. ільнавалакна. Утаўнаважаны тав. СЬЦЯЖКО і карабейнік тав. КРОХ па Дзержавіцкім сельсавеце загатовілі 15 цэнтн.

Ва ўдарны месячнік завяршэньня ільназагатовак трэба яшчэ больш узмацніць тэмпы работы, каб дабіцца поўнага выкананьня пляну.

З. Р.

Праверыць выкананьне кантрактацыйных дагавароў

ПОЛАЦАК. (Белта).

Тэмпы ільназагатовак вусім незадавальняючыя. Загатоўчы плян выкананы на 45,3 проц. За дэкаду па цьвёрдых заданьнях не паступіла ніводнага кг. валакна. Між тым, кулацка-заможнымі гаспадаркамі заданьне па раёне выкананы толькі на 27,4 проц.

Амаль спынілі здачу валакна кантрактанты, якія выканалі свае абавязкі па дагаворах усяго на 19,8 проц.

Такія сельсаветы, як Бальскі, Семяніцкі, Бяярскі, Махраўскі і Шэлдаўскі на працягу 2-х месяцаў не далі прыросту нават их адзін проц. Іншыя сельсаветы — Наўліцкі, Бабініцкі, Булаўскі, Васілеўскі, Баронінскі, Дамнікоўскі — выканалі свае планы ад 19 да 30 проц.

Выклік Дрысеншчыны аб арганізацыі ўсебеларускага чырвонага абозу не падхопілі мясцовыя арганізацыі.

Д. Іваноў

Першы ў сьвеце аўтагігант

(Ніжагародзкі завод імя Молатава)

На тэрыторыі ў 425 гэкт. за 17 месяцаў пабудован і пушчан 1 студзеня 1932 году першы ў сьвеце аўтамабільны гігант—Ніжагародзкі завод імя Молатава. За гэтыя месяцы гераічнай будоўлі паднята 1.600.000 кбм. зямлі, укладзена 30 мільёнаў цэглы, вычатквана 180.000 кбм. бэтону, 500.000 кбм. лесу, 25.000 тон металю, 186.000 кв. мэтраў шкла, пакладзена пад зямлёй 150 клм. труб, 3.000 клм. электрычнай праводкі. Пабудавана 3.000 кбм. вытворчай плошчы, 200.000 кв. мэтраў плошчы жылых памяшканьняў, 25.000 кв. мэтраў бытавых і культурных устаноў. Змантавана каля 5.000 варштатаў, пракладзена 90 клм. чыгункі і 20 клм. дарогі. Сымфонія лібаў досыць выразная!

Усё гэта зроблена на пустыры, парослым хмызьнякамі. Мэтр за мэтрам адваёўвалася плошча, цагліна за цаглінаю расьлі будынкі, узьнімаліся масыўныя жалезныя канструкцыі, узьнімаліся цэхі, пад напорам тысяч самаадданых сацыялістычнаму будаўніцтву будаўнікоў рос завод. У гісторыі сацыялістычнага будаўніцтва барацьба за аўтагігант будзе адной са слаўных старонак, якая сьведчыць аб найвялікшым энтузіязьме, упартасьці, бальшавіцкай энэргіі ўдарнікаў сацыялістычнай будоўлі.

Ліцейная Ніжагародзкага аўтазаводу сканцэнтравала ўнутры сябе навейшыя дасягненьні ліцейнай тэхнікі сьвету. Усё найбольш дасканалае, створанае капіталізмам за апошнія стагодзьдзе і раскіданае па ўсім сьвеце, сабрана тут сьвядомай воляй пралетарыяту.

Ліцейная ціхагарадзкага аўтазаводу—гэта новая і вялізарная перамога рабочай клясы Савецкага Саюзу, перамога сацыялізму.

Вядучым зьвяном у вытворчай сыстэме заводу зьяўляецца **кузьня.** У ёй вырабляецца 170 дэталяй для аўтамабіляў, пераважная частка якіх вельмі адказныя.

Тэхналёгічны працэс усіх дэталяй пераняты ў амэрыканскіх аўтамабільных заводаў. Абсталяваньне кузьні зьяўляецца лепшым абсталяваньнем у сьвеце. Паравыя і падаючыя малаты, коваўчыя машыны пабудаваны паводле апошняга слова тэхнікі.

На працягу году кавальскі цэх патрабуе 45.000 тон сталі. У ім будзе занята ў дзьве зьмены 1.200 рабочых.

Праектаваньне кузьні зроблена пад кутом погляду стварэньня найлепшых умоў працы для рабочых—няма такіх куткоў, куды-б ня трапіла сьвежае паветра. Тут зроблена ўсё, што можна было зрабіць для палягчэньня работы кавалёў. Па разьмеры плацу і па колькасьці абсталяваньня кузьня зьяўляецца самым буйным з аналёгічных цэхаў прадпрыемстваў аўтатрактарнай прамысловасьці (АМО, СТЗ, ХТЗ, Пуцілаўскі).

Цэхі вузлавой зборкі разьлічаны на выпуск 210 камплектаў у адну зьмену. Цэх канчатковай зборкі будзе выпускаць 20 проц. сабраных агрэгатаў (70 машын у адну мінуту). Іншыя 80 проц. сабраных агрэгатаў будуць рассылацца па зборачныя заводы, разьмешчаныя ў розных гарадох Саюзу. Цэх разьлічан на выпуск 80 машын у адну зьмену. У матора-зборачным цэху дэталі пасьля мэханічнай апрацоўкі падаюцца падважным канвэерам на зборку. Усяго ў цэху 4 канвэеры. Матора-зборачны цэх пры поўным развароце вытворчасьці будзе выпускаць 210 матораў у адну зьмену.

На заводзе паладжана спэцыяльная выпрабавальная станцыя для выпрабаваньня матораў і інш. агрэгатаў. Гэта станцыя значна больш дасканалая, чым Форда і іншых аўтамабільных заводаў Эўропы і Амэрыкі.

Цэх зборкі мастоў уключае ў сябе тры групы: зборка заднягa маста грузавой машыны, заднягa маста лёгкай машыны і пярэдняй восі.

Вось кароткая характарыстыка аўтазаводу, якая гаворыць аб гігантызме разьмерах савецкага гіганта. Пабудова яго каштавала 250 мільёнаў рублёў. Завод разьлічан на выпуск 140.000 аўтамабіляў у год. Кожны дзень з канвэеру выходзіць 1½-тонныя грузавыя машыны—савецкія форды маркі «А». У недалёкім будучым будзе таксама паладжан выпуск легкавых машын маркі «А».

Асноўнае зьвяно работы на заводзе—гэта дасканалае асваеньне масавай вытворчасьці. Няма ніякіх сумненьняў, што і гэты вучастак будзе пераможан і вызначаны плян выпуску аўтамабіляў у 1932 годзе будзе выкананы і перавыкананы.



Зацыялістычны горад — аўтазавод

Конная паліцыя ў Варшаве топча галодных жанчын і дзяцей

Замест хлеба і працы—бранявікі і пажарныя помпы

Поўныя драматызму сцэны

ВАРШАВА. У цэнтры Варшавы разыграліся поўныя драматызму сцэны. Увесь Тэатральны пляц, а таксама частка вакольных вуліц былі заняўнены беспрацоўнымі-дэманстрантамі. Пешая паліцыя аказалася ня ў стане разагнаць прысутных. Частка дэманстрантаў аказала паліцыі супраціўленьне. Некалькі паліцэйскіх былі збіты, выбіты шыбы ў некаторых суседніх дамох.

Некалькі соцень чалавек, у тым ліку шмат жанчын і дзяцей, ляглі на зямлі трамвая і на брук, поўнасьцю паралізаваўшы рух. Прыбыўшы атрад конная паліцыі пачаў таптаць ляжаўшых на зямлі дэманстрантаў. У ход былі пушчаны шват спэцыяльныя бранявікі з пажарнымі помпамі, якія аблівалі рабочых вадой. Звалка працягвалася **больш гадзіны.** Сярод беспрацоўных папыралася вялікая колькасьць камуністычных адозваў. **Паліцыя арыштавала звыш 20 чалавек. (ТАСС).**

20.000 пралетараў выкідваецца на вуліцу

ВАРШАВА, 1. Крызіс, які ахапіў усе галіны прамысловасьці краіны, за выключэньнем ваеннай, пагыбляецца шпаркімі тэмпамі. Спыняюцца адна за адной фабрыкі і заводы. Кожны дзень новыя і новыя тысячы беспрацоўных павялічваюць рады вялізарнай армі «лішніх» людзей.

Лепшай ілюстрацыяй гаспадарчага развалу фашыстскай Польшчы можа быць становішча яе цяжкай індустрыі. Верхняя Сілезія цяпер перастала быць магутным цэнтрам польскай прамысловасьці. Цяпер — гэта сапраўды польскі могільнік», як трапна скаваў адзін з буржуазных журналістаў. **Мёртвыя капальні і заводы, шматтысячны шэры натоўп пазбаўленых працы рабочых — вось малюнак Верхняй Сілезіі.**

У апошнія дні рад новых прадпрыемстваў цяжкай прамысловасьці абвясьцілі лёкаут. Спыніла працу капальня «Іовіцэ» у Дамброўскім басэйне. Прычына — адсутнасьць рынку збыту. **1.500 рабочых выкінуты на вуліцу.**

Абвясьціла лёкаўт капальня «**Графіня Ляўра**», у выніку чаго страціла працу 1.560 рабочых. Капальня «**Павал**» звольніла 150 рабочых. Спыняе працу капальня «**Вольфганг-Ваэзэль**», «**Шарлёта**» (1.200 рабочых) і «**Флёрэнтына**» (1.380 рабочых). Дырэкцыя металюргічнага заводу «**Гута крулевска**» скарацила штат рабочых на 230 чал. Разам у бліжэйшы час пазбаўляецца працы звыш 20.000 верхнясілезкіх пралетараў.

Характэрным у адносінах росту беспрацоўя зьяўляецца горад Хажоў (каля Катовіц). У той час, калі ў 1929 годзе ў Хажове працавала 3.000 рабочых, дык у 1932 г. лічба гэта зьнізілася да 1.860. На днях дзяржаўная фабрыка штучных угнаенняў у Хажове **скарачае 500 новых рабочых.** Такімі тэмпамі расьце ў польскіх гарадох беспрацоўе.

Папітычны працэс у Вільні

ВІЛЬНЯ. У Віленскім акруговым суде адбыўся працэс **групы работніц**, абвінавачаных у тым, што яны **8 ліпеня** мінулага году прымалі ўдзел у дэманстрацыі каля Лукіскай турмы. У гэты час на Лукісках палітзьняволеныя прыступілі да салідарнай забастоўкі ў знак пратэсту супроць увядзеньня новага турэмнага рэгламанту. Паліцыя разагнала дэманстрантаў, арыштоўваючы шмат каго з іх.

На суд зьявілася толькі адна **С. Банкава** (18 год). Рэшта работніц на працэс не зьявіліся. **Акруговы суд прыгаварыў Банкаву да 4-х год катаргі.** Наконт падсудных, якія не зьявіліся на працэс, суд разаслаў па тэлеграфу загад **затрымаць іх.**

Забойства камісара палітычнай паліцыі Чахоўскага

Масавыя арышты ва Львове

ВАРШАВА, 30. 22 сакавіка ва Львове забіт камісар львоўскай палітычнай паліцыі—вядомы кат украінскіх працоўных мас—дэфэнзыўчык **Чахоўскі.**

Забойства Чахоўскага выклікала сярод львоўскіх акупацыйных улад і ў Варшаве—вялікае ўражаньне. **Ня гледзячы на славутую крывавую «пацыфікацыю», тэрарыстычныя акты на Заходняй Украіне ня спыняюцца.** Восеньню мінулага году на Заходняй Украіне быў забіт інцыятар і натхніцель пацыфікацыі, кат падняволеных народаў Польшчы **ТАДЭУШ ГОЛУЎКА.** Цяпер загінуў ад кулі тэрарыстаў камісар палітычнай паліцыі **ЧАХОЎСКІ**—выдатная палітычная фігура акупантаў.

Паліцыя вядзе «энэргічнае сьледзтва», шукаючы вінаватых у забойстве. На ногі пастаўлен увесь апарат дэфэнзывы. Прыехалі з Варшавы і асабіста кіруюць сьледзтвам начальнік аддзелу бясьпечнасьці пры міністэрстве ўнутраных спраў **Кухарскі** і інспэктар **Пёнткевіч.**

Ва Львове палітычная паліцыя правяла масавыя арышты. **Арыштаваны звыш 50 украінцаў.** Рэзультаты сьледзтва трымаюцца ў вялікай таямніцы. Прэса пацяшае сябе тым, што сярод арыштаваных «здаецца, знаходзіцца забойца Чахоўскага».

Рэпрэсіі сацыял-цэргібеляў супроць кампартыі

БЭРЛІН. Берлінская арганізацыя кампартыі пачала прадвыбарную кампанію ў сувязі з надыходзячымі выбарамі ў Прускі ландтаг. Старшыня кампартыі Прускага ландтагу **Кастэр** зьвярнуўся да прускага сацыял-дэмакратычнага міністра ўнутраных спраў Зэвэрынга з адкрытым лістом, у якім, выкрываючы здрадніцкую палітыку сацыял-дэмакратыі Прусіі і абвяшчаючы блізкую расплату рабочай клясы, за фашыстскую палітыку сацыял-дэмакратыі, запрашае Зэвэрынга на масавы мітынг, які адбудзецца 4 красавіка. Зэвэрынгу забясьпечваецца неабмежаваны час у яго выступленьні.

У другім туры прэзыдэнцкіх выбараў фігуруюць 3 кандыдаты—Гінэнбург, Гітлер ад капіталістаў і **Тэльман ад рабочай клясы.** Надзвычайны распараджэньні супроць рабочай клясы следуюць адно за другім. Сацыял-дэмакратычны начальнік паліцыі Грэзінскі забараніў прадастаўляць у распараджэньне кампартыі берлінскі аўстэртэн, дзе павінны былі адбыцца масавыя мітынгі супроць вайны, голаду і фашызму, якія склікаюцца 8 і 19 красавіка.

Сацыял-дэмакратычны начальнік паліцыі забараніў праведзеньне эстафэты чырвоных спартсмэнаў у гонар Тэльмана. Грэзінскі выдаў новае распараджэньне, якім **устанаўляецца папярэдняя цэнзура ўсіх спэцыяльных выданьняў газэты «Ротэ Фанэ».**

Міністар унутраных спраў агульна-германскага ўраду **Грэнэр** на падставе надзвычайнага дэкрэту, забараніў кіно-фільм «Кюле Валмэ», створаны калектывам пралетарскіх работнікаў мастацтва.

Справа правакатара Штэрна назначаецца на 4-га красавіка

Справа па абвінавачаньні **Штэрна І. М.** і **Васільлева С. С.** у замаху на дарадцу германскага пасольства пана фон Твардоўскага сьледзтвам скончана і назначаецца да слуханьня **4 красавіка** ў ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюзу пад старшынствам т. **Ульрыха В. В.**

Дзяржаўнае абвінавачаньне будзе падтрымліваць тав. **Крыленка Н. В.**

З 20 шылінгаў паступленьняў--13,5 на ўзбраеньні

ЛЮНДАН, 1. «**Дэйлі Уоркер**», каментуючы даныя аб выніках закончанага бюджэтнага году ў Англіі, указвае, што з **кожных 20 шылінгаў бюджэтных паступленьняў** ангельскага ўраду ў бягучым годзе **13,5 шылінгаў было выдаткавана** ўрадам на плацяжы па старых войнах і **на падрыхтоўку новых.** Як указвае газэта, **толькі 6,5 шылінга** з кожнага фунта бюджэтных паступленьняў выдаткоўваліся на сацыяльныя патрэбы: **асьвету, ахову здароўя, дапамогі, пэнсіі і г. д.**

Устанаўленьне паветраных зносін паміж Масквой і Ігаркай

МАСКВА. 31 сакавіка на трохматорным самалёце з Масквы вылядзеў тав. **Чухноўскі,** з мэтай абсьледваньня зімовай трасы і ўстанаўленьня рэгулярных паветраных зносін паміж Масквой і Ігаркой, на адлегласьці ў 6 тыс. кілёмэтраў. Самалёт ляціць праз Казань, Сьвярдлоўск. Омск, Новасібірск, Красноярск. У першы рэйс самалёт даставіць у Ігарку групу работнікаў і пошту.

Арганізацыя брыгад рабочых-тарфянікаў, давядзеньне да іх вытворчых плянаў—

баявыя задачы падрыхтоўкі да торфсэзону

Аформіць вярбоўку дагаворамі

Адной з асноўных умоў пасьпяховага выкананьня пляну торфаздабычы зьяўляецца поўнае забясьпячэньне торфазаводаў рабочай сілай. Таму своячасовае і шырокае разгортваньне вярбоўкі рабочых-тарфянікаў — важнейшая задача падрыхтоўкі да торфсэзону.

Як-жа тарфяная прамысловасьць БССР ажыцьцяўляе гэту задачу? Як партыйна-прафэсыянальныя арганізацыі тарфяных заводаў разгарнулі работу па арганізаваным наборы на торфараспрацоўкі калгасьнікаў - адыходнікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў? Для поўнага забясьпячэньня торфазаводаў рабочай сілай Белторфу патрэбна 10.040 рабочых-тарфянікаў. На 25 сакавіка завербавана 7.147 чалавек, плюс 1.084 ч., закантрактаваных заводамі ў мінулым годзе. Такім чынам выканана 82 проц. заданьня.

Большасьць заводаў (Асінторф, «Шлях сацыялізму», імя Даўмана, «Свабода», «Новая Беларусь», «Давыдаўка», імя Гея) завербавалі ўсю неабходную колькасьць рабочых. Толькі торфазаводы «Чырвоная Беларусь» і «Чырвоны сьцяг» завербавалі менш паловы.

Калі да апошкі ходу вярбоўкі падыйсьці з пункту гледжаньня колькасных паказальнікаў, дык справа стаіць як быццам здавальняюча. Але бяда ў тым, што ў большасьці вярбоўка дагэтуль не аформлена дагаворамі і рабочыя не арганізаваны ў брыгады. Ня складзены і не даведзены да брыгад прамфінпляны здабычы торфу на сэзон. На сёньняшні дзень толькі два заводы (Асінторф і «Шлях сацыялізму») скончылі гэту работу. Большасьць-жа абмежавалася складаньнем сьпісаў усіх жадаючых пайсьці працаваць. У выніку замест 523 брыгад, якія павінны быць арганізаваны і афарміены дагаворамі, на 25 сакавіка створана толькі 310. Характэрна адзначыць, што торфазавод імя Даўмана, завербаваўшы рабочых на 40 проц. больш патрэбнай колькасьці, арганізаваў і аформіў дагаворамі замест 39 брыгад толькі адну. Торфазавод «Свабода» завербаваў на 10 проц. больш рабочых, чым патрэбна, а брыгад замест 37 арганізавана 13. Завод імя Гея завербаваў 99 проц. рабочых-тарфянікаў, а брыгады не арганізаваў ні адной. Такое-ж прыблізна становішча і на заводах імя 1 мая, «Чырвоны сьцяг», «Чырвоная Беларусь».

Усё гэта гаворыць аб тым, што партыйна-прафэсыянальныя арганізацыі большасьці торфазаводаў зусім недаацэньваюць і ігнаруюць першую ўмову тав. Сталіна аб арганізаваным наборы рабочай сілы, праводзячы яго (набор) па-старому, самацёкам. У выніку ня выключана такая магчымасьць, што заводы, якія зараз лічаць сябе поўнасьцю забясьпечанымі рабочай сілай, да пачатку работ акажуцца зусім без рабочых. Паколькі дагаворы не заключаны, брыгады не арганізаваны, рабочыя могуць і не зьявіцца на работу.

З такімі зьявішчамі неабходна павесьці рашучую барацьбу. **Вярбоўку трэба неадкладна аформіць дагаворамі і ўсіх рабочых арганізаваць у брыгады. Да брыгад уже зараз павінны быць даведзены канкрэтныя пляны работы на ўвесь торфсэзон.** Распрадаваць гэтыя пляны **па брыгадах, правесьці вытворчыя канферэнцыі рабочых — баявая задача заводзкіх прафэсыянальных арганізацый.**

Арганізавана толькі адна брыгада

МАГІЛЕЎ. Вярбоўка рабочых на торфазаводзе «Чырвоная Беларусь» праходзіць вельмі слаба. На 25 сакавіка завербавана ўсяго 38 проц. патрэбнай колькасьці. Але і гэта колькасьць да гэтага часу яшчэ не аформлена дагаворамі.

Каб забясьпечыць пасьпяховае выкананьне пляну торфаздабычы, заводу неабходна мець ня менш 34 рабочых брыгад. У выніку замест 5 брыгад, якія павінны быць арганізаваны і аформлены дагаворамі, на 25 сакавіка створана толькі 310. Характэрна адзначыць, што торфазавод імя Даўмана, завербаваўшы рабочых на 40 проц. больш патрэбнай колькасьці, арганізаваў і аформіў дагаворамі замест 39 брыгад толькі адну. Торфазавод «Свабода» завербаваў на 10 проц. больш рабочых, чым патрэбна, а брыгад замест 37 арганізавана 13. Завод імя Гея завербаваў 99 проц. рабочых-тарфянікаў, а брыгады не арганізаваў ні адной. Такое-ж прыблізна становішча і на заводах імя 1 мая, «Чырвоны сьцяг», «Чырвоная Беларусь».

Не падрыхтаваліся да прыёму рабочых

БАРЫСАЎ. Торфазаводу «Камунар» у гэтым годзе патрабуецца 500 рабочых. На сёньняшні дзень ужо завербавана каля 85 проц. патрэбнай колькасьці. Аднак, завод дагэтуль яшчэ не падрыхтаваўся да прыёму рабочых: пабудаваныя баракі могуць задаволіць жыльём ня больш 170 чалавек. Кіраўніцтва заводу паставіла перад Бярозінскім камбінатам, якому перададзены торфазавод, пытаньне аб замацаваньні за ім аднаго жылога дому. Але кіраўніцтва камбінату марудзіць з вырашэньнем гэтай справы.

Рабочыя зусім не забясьпечаны спэцпратканай: няма бахіл і лапцей. Бярозінскі камбінат і ў гэтай галіне ніякай дапамогі заводу не аказвае. Снабжэньне рабочых пастаўлена нездавальняюча: по разгорнуты самазагатоўкі прадуктаў, торфрабкоп бязьдзейнічае і ніякай увагі самазагатоўкам не аддае.

Добра стаіць справа з рамонтам машын. Рамонтная брыгада тав. **Гольфарба** па-ўдарнаму рыхтуе машыны да сэзону; яна абвясьціла сябе ўдарнай і абавязалася поўнасьцю скончыць рамонт і зборку машын да 15 красавіка.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ»:
Шмідт, Стрэнгін, Савельзон і Ізмайлін.

Сустрэчны ў 18 тыс. тон

ВОРША (Белта). Нядаўна на торфазаводзе «Асінторф» адбылася вытворчая канферэнцыя рабочых, ІТР, служачых і дэлегатаў ад завербаваных сезонных брыгад тарфянікаў. Абгаварыўшы плян торфаздабычы на 1932 год, канферэнцыя знайшла, што лічба, якая вызначана Белторфам у 180.000 тон, не забясьпечвае цалкам запалам БелДРЭС і высунула **сустрэчны** у 18.000 тон.

Тарфкому даручана ўключыць у новы калдагавор нормы выпрацоўкі на аднаго рабочага ў дзень: па здабычы торфу — 1,6 тоны (рост супроць мінулага году на 33 проц.), па сушцы і ўборцы — 1,95 тоны (рост на 34 проц.).

Канферэнцыя завастрыла ўвагу заводзкіх арганізацый па паляпшэньні культурна-бытавых умоў, на ажыўленьні работы вытворчых нарад, на разгортваньні сацыялістычных мэтадаў працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Горача вітаем пастанову ЦК і СНК аб пабудове дамоў для спэцыялістаў

Агульна-заводзкі мітынг інжынэрна-тэхнічных работнікаў **чырвонасьцяжнай гарбарні «Бальшавік»**, абгаварыўшы пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб пабудове дамоў для спэцыялістаў і палепшэньні жыльлёвых умоў ІТР, пастанавіў:

— Мы, ІТР гарбарні «Бальшавік», горача вітаем пастанову партыі і ўраду аб палепшэньні сацыяльна - бытавых умоў спэцыялістаў. Гэта пастанова зьяўляецца новым паказальнікам правільнай палітыкі партыі Леніна, яна абвяргае ўсю хлусьню буржуазных пісак адносна становішча спэцыялістаў у СССР.

У адказ на пастанову партыі і ўраду мы абяцаем яшчэ больш узмацніць тэмпы барацьбы за поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну 1932 году.

Мы бярэм на сябе абавязацельства па індывідуальным шэфстве над рабочымі - рацыяналізатарамі і вынаходцамі.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

ПАСТАНОВА НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ПРАЦЫ БССР

30 сакавіка 1932 г. № 16. гор. Менск.

„Пра забясьпячэньне рабочай сілай і спэцыялістамі торфазаводаў і прадпрыемстваў будматар'ялаў".

У мэтах поўнага забясьпячэньня рабсілай і спэцыялістамі торфазаводаў і прадпрыемстваў будматар'ялаў у надыходзячым сэзоне 1932 году, у выкананьне пастановы дырэктыўных органаў па гэтым пытаньні, НАРОДНЫ КАМІСАРЫ�ЯТ ПРАЦЫ БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У галіне забясьпячэньня рабочай сілай.

1. Абавязаць аб'яднаньне будматар'ялаў, усе керамічныя мясцовыя трэсты і торфаб'яднаньне і інш. арганізацыі, якія ядуць торфараспрацоўкі, узмацніць работу па арганізаваным наборы рабсілы ў вызначаных Наркампрацы раёнах вярбоўкі.

Для забясьпячэньня поўнага набору рабсілы для гэтых галін прамысловасьці працягнуць раней вызначаны тэрмін набору рабсілы да 15-IV—1932 году.

2. Прапанаваць Белторфу і аб'яднаньню будматар'ялаў даць вылучаным работнікам і вярбоўшчыкам канкрэтныя заданьні па наборы рабсілы з вызначэньнем колькасьці падлягаючых набору рабочых і ўстанавіўшы адказнасьць за выкананьне ў тэрмін гэтых заданьняў.

3. Абавязаць усе мясцовыя органы працы і прасіць усе гарадзкія і раённыя кіруючыя арганізацыі аказаць усямерную дапамогу прадстаўнікам торфапрамысловасьці і прамысловасьці будматар'ялаў і іх вярбовачнаму апарату ў справе своячасовага скончаньня набору рабсілы, зьвярнуўшы пры гэтым асаблівую увагу на набор кваліфікаваных рабсілы, ня спыняючыся ў неабходных выпадках ад ізыцьця кваліфікаваных рабочых нават у тых сельсаветах і калгасах, якія прымацаваны да іншых гаспадарчых арганізацый.

У галіне забясьпячэньня спэцыялістамі і рахункавымі работнікамі.

4. Для забясьпячэньня торфазаводаў і прадпрыемстваў будматар'ялаў спэцыялістамі і рахункавымі работнікамі накіраваць у распараджэньне Белторфу аб'яднаньня будматар'ялаў 39 чал. інжынэрна-тэхнічных і 22 чал. рахункавых работнікаў.

Паказаную колькасьць работнікаў адкамандыраваць з наступных прадпрыемстваў і ўстаноў.

№ № пп.	Назва прадпрыемства, ці ўстановы	Спэцыяльнасьць	Кольк. работн.	У чыё распараджэньне накіроўваецца
1.	Курсы інжынэраў пры Будінце	"	3	
2.	" " "	Інж.-буд.		Белторфаб'яднаньне
3.	НДІ прамысловасьці	"	4	Аб'яднаньне Будматар'ялаў
4.	"	Інж. мерам.	2	"
5.	Прасект, к-ра Белбудаб'яднаньня	Інж.-тэхнол. Інжынэр-цеп.	1	"
6.	Хэміка-тэхнадлёгіч. Тэхнікум	Тэхнік-лятэхнік	1	"
7.	Сантэхбуд	Тэхнікаў-керамікаў	12	"
8.	РВК—г. Магілеў	Тэх. механ.	1	"
9.	Белкавапрамсаюз	Эканам. планав.	1	"
10.	НДІ імя Леніна	Эканам. планав.	1	"
11.	Кір. Унівэрсыт. Гарадка	Бухгальтароў	1	"
12.	Белскурабаб'яднаньне	Бухгальтароў	1	"
13.	Белшавэйаб'яднаньне	"	1	"
14.	Магілеў-Райспажыўсаюз	Эканам. планав.	1	"
15.	Рачыца—Райфа	Бухгальтароў	1	"
16.	Барысаў—Белкавапрамсаюз	Бухгальтароў	1	"
17.	ВСНГ БССР	Эканам. планав.	3	Белторф
18.	Белпма—Менск	Тэхнікаў-будаўн.	1	"
19.	Гомель—Белбудкантора	" "	1	"
20.	Ворша—Белбудкантора	" "	1	"
21.	Віцебск—Вадзяанал	" "	1	"
22.	Магілеў—Белбудкантора	" "	1	"
23.	Заліўшчык 2-х тэхнікаў-будаўнікоў, накіраваных у выпуску Менскага Архітэктурнага Тэхнікуму		Белторф ВСНГБ з лютэўскага выпуску	
24.	УЭП—Менск	Тэхнікаў-электрыкаў	2	Белторф
25.	Віцебск—Белзнэрга	"	1	"
26.	Гомель—Жылсаюз	Ст. бухгальтароў	1	"
27.	Віцебск—НКСнаб	" "	2	"
28.	Віцебск—зав. „Чырвоны Мэталіст"	Бухгальтароў	1	"
29.	Гомель—ЦРК	Ст. бухгальтароў	2	"
30.	Гомель—Дзяржбанк	"	1	"
31.	Менск—ф-ка „Камунарка"	Бухгальтароў	1	"
32.	Менск—Сьвінаводтрэст	"	1	"
33.	Менск—НКСнаб	"	1	"
34.	Ворша—Райкамбінат	"	1	"
35.	Ворша—Райтранс	"	1	"
36.	Віцебск—Ільнакананаплябуд	"	1	"
37.	Бабруйск—Райспажыўсаюз	"	1	"
38.	Бабруйск—Банк	"	2	"
39.	Віцебск—Белгандаль	Тэхнікаў	1	"

Абавязаць кіраўнікоў вышэйпералічаных арганізацый у 3-дзённы тэрмін адкамандыраваць паказаную вышэй колькасьць работнікаў у распараджэньне Белторфу ці аб'яднаньня будматар'ялаў для скарыстаньня іх на сталай рабоце непасрэдна на заводах.

5. Абавязаць усе дзяржаўныя і гаспадарчыя арганізацыі, установы і прадпрыемствы вызваліць занятых у іх спэцыялістаў-практыкаў па вырабе будматар'ялаў і па здабычы торфу і сьпісы іх падаць у мясцовыя органы працы не пазьней 10-IV—1932 г. па наступнай форме:

а) Прозьвішча, імя і імя па бацьку.
б) У якасьці якога і з якога часу працуе ў даным прадпрыемстве ці ўстанове.
в) Колькі гадоў і па якой спэцыяльнасьці працаваў у торфапрамысловасьці будматар'ялаў.
г) Узрост і партыйнасьць.

УВАГА: Асобы, якія займаюць выбярныя пасады і кіраўнікі прадпрыемстваў у сьпісы ня ўключаюцца.

6. Даручыць тав. РАДЗІОНАВУ у 3-дзённы тэрмін даць паказаньне мясцовым органам працы аб парадку накіраваньня на работу спэцыялістаў, паказаных у п. п.: 4 і 5 гэтай пастановы.

7. Даручыць сэктару арганізацыі і ўдзараўленьня ўмоў працы пад адказнасьць тав. ІОЗЭФА, сумесна з Цэнтральнымі Праўленьнямі адпаведных саюзаў, арганізаваць у пэрыяд з 15-IV па 15-V—1932 году выбарачную праверку важнейшых торфяных і натэльных заводаў па пытаньні арганізацыі працы, расстаноўкі і скарыстаньня рабсілы, тэхнікармаваньня і сацыяльна-бытавога абслугоўваньня рабочых (забясьпячэньне мыльлём, сталоўкамі, спец. вопраткай і г. д.).

8. Прапанаваць усім мясцовым органам працы ўстанавіць сталы нагляд за выкананьнем паказаных у гэтай пастанове мерапрыемстваў і асоб вінаватых у невыкананьні іх прыцягваць да суровай адказнасьці.

Народны Камісар Працы БССР БАСКІН.

4-га красавіка, роўна ў 6 гадзін вечара, у памяшканьні Белдзяржтэатру
АДБУДЗЕЦЦА АДКРЫЦЬЦЁ
2-га Усебеларускага зьезду інжынэрна-тэхнічных работнікаў саюзу прамкамжылбудаўніцтва.
Рэгістрацыя дэлегатаў праводзіцца ў памяшканьні ЦП саюзу прамкамжылбудаўніцтва Бел. (Дом Працы, 3-ці паверх, пакой № 10) з 2-га красавіка.
Уваход на адкрыцьцё зьезду па мандатах і запрашальных білетах, раздаваным прафарганізацыям.
Арг. камісія.

Чырвоная Зорка — Гунавы мастацкі фільм ДЗЬВЕ СУСТРЭЧЫ драма ў 7 частках.
„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". — НАТА ВАЧНАДЗЭ на усходнім фільме ГЮЛІ драма ў 7 частках.
ПРАЛЕТАРЫ. — ПАТ І ПАТАШОН у камэдыі ПАДАРОЖНІКІ драма ў 7 част.
„СПАРТАК" — Амэрыканскі фільм НЕБАСКРОБ камэдыя ў 5 частках.

МЭДЫЧНАЯ РАДЫЁ-ГАЗЭТА
„НА ФРОНЦЕ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ"
Беларускі Інстытут Удасканаленьня Мэдкадраў
АБВЯШЧАЕ,
што з красавіка месяца г. г. пачынае выходзіць мэдычная радыё-газэта, якая мае мэтай удасканаленьне дактароў і сярэдняга мэдперсаналу.
Газэта перадаецца праз радыё-вяшчаньне
6, 18 і 20 кв. 20 г. 15 м. да 21 г. 15 м. вечара.
У якасьці дадатку будзе выходзіць лістон заочніка для слухачоў заочнага мэдінстытуту.
6-IV будзе лекцыя па біялёгіі (уступная) і лекцыя „Аб значэньні заочнай мэдычнай адукацыі".
Дырэкцыя Інстытуту.

СЁНЬНЯ, 3-га красавіка, у 7 гадз. веч. у клюбе „МЭДПРАЦАЎНІК" (Рэвалюцыйная, 2) адбудзецца
НАРАДА членаў санпрафсэкцыі.
Явка абавязкова.
САНПРАФБЮРО.

4 красавіка, у 7 гадз. веч., у памяшканьні пэдабінету (Дом Працасьвету) адбудзецца пасяджэньне
ІНСТЫТУТУ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА БАН
сумесна з секцыяй выкладчыкаў мовы і літаратуры ФЗС, на якім будзе заслухана даклад акад. Замоціна—„Мэтадычная структура лябараторных заданьняў па літаратуры".
Запрашаюцца настаўнікі, студэнты і ўсе жадаючыя.

Беларускае Рэспубліканскае Аддзел.
„Установка"—ЦІП
прапануе ўсім былым курсантам і інструктарам не пазьней 6 красавіка г. г.
атрымаць свае аблігацыі
„5-цігодка—за 4 гады" і „3-га рашаючага году".
Аблігацыі можна атрымаць у канторы «УСТАНОЎКА» па Чырвонаармейскай в. № 16 пакоі № 16 з 9 г. раніцы да 3 гадз. дня.
Пасьля паказанага тэрміну аблігацыі будуць адданы ў Менскую Апчэкадасу № 16, куды трэба будзе зьвярнуцца за атрыманьнем гэтых.
„ЦІП—Установка".

ПАТРЭБНЫ
для Інстытуту эканомікі БАН два статыстыкі.
Аплата па згодзе.

П. АНДРОЎСКІ

Дунайскія лятуценьні пана Тард'е

Прыпоўшы да ўлады пасьля ўпаду кабінэту Лявэля, новы французкі прэм'ер Тард'е, які пакінуў сабе таксама партфэль міністра замежных спраў, паклапаціўся аб тым, каб зрабіць свой «выхад» на сусьветную палітычную арэну магчыма больш эфэктыўным.

Пан Тард'е адзначыў свой паварот да міжнароднай палітычнай актыўнасьці двума эфэктыўнымі кунштукамі. Першае — гэта высунуты на міжнародній канфэрэнцыі па «разбраеньні» славуты праект стварэньня ўзброенай сілы пад эгідай Лігі нацый. Аналіз гэтага праекту мы ўжо ў свой час давалі. Другое — гэта праект стварэньня так званай дунайскай федэрацыі, які ажыўлена абмяркоўваецца зараз усім эўрапейскім друкам.

Сутнасьць дунайскага праекту Тард'е заключаецца ў імкненьні французкага імпэрыялізму прыйсьці на дапамогу сваім васалам — аграрным краінам, Паўднёва-Ўсходняй і Цэнтральнай Эўропы. Гэтыя краіны ў рэзультаце зацяжнага аграрнага крызісу, які ўсё больш пагыбляецца, прышлі ў стан блізкі да катастрофы.

Вялізарнае паданьне цэн на с.-г. тавары, скарачэньне рынкаў збыту, канкурэнцыя заакіянскіх краін і абмежаваны ўсім гэтым вялізарны рост запасаў, якія не знаходзяць сабе збыту, — усё гэта робіць пытаньне аб рынках збыту пытаньнем жыцьця, або сьмерці для буржуазіі і кулацкай праслойкі такіх краін, як Румынія, Югаславія, Вэнгрыя, Баўгарыя і інш.

Французкі імпэрыялізм зацікаўлен ва ўмацаваньні становішча сваіх васалаў у Паўднёва -Ўсходняй і Цэнтральнай Эўропе і разам з тым імкнецца выкарыстаць цяжкае становішча такіх краін, як Аўстрыя, Вэнгрыя і Баўгарыя, для замацаваньня і ў гэтых краінах свайго ўплыву. Як вядома, яшчэ некалькі год назад Італія даволі пасьпяхова змагалася з французкім уплывам у гэтых трох краінах. Зараз Італія аслаблена фінансавым крызісам, і Францыя спрабуе выкарыстаць сваю фінансавую магутнасьць для таго, каб шляхам аказаньня «дапамогі» гэтым краінам канчаткова выцясьніць адтуль італьянскі ўплыў.

Дунайскі плян Тард'е вядомы пакуль у агульных рысах. Згодна гэтага пляну, першая «стадыя» дунайскай федэрацыі павінна заключацца ў тым, каб пяць краін, а іменна Аўстрыя, Вэнгрыя, Чэха-Славакія, Румынія і Югаславія павінны заключыць паміж сабою папарна згоды, паводле якіх яны прадастаўляюць адна адной пераважныя «прэфэрэнцыяльныя» мытныя тарыфы. Такім чынам, аўстрыйскай і чэха-славацкай прамысловасьці забясьпечваецца рынак аграрных краін Малой Антанты і Вэнгрыі, а апошнім забясьпечваецца для іх с.-г. тавараў рынак Аўстрыі і Чэха-Славакіі. Канкрэтна гэта азначае, што для Вэнгрыі, Румыніі і Югаславіі, разам узятых, забясьпечан экспарт прыкладна ў два з паловай мільёны квінталаў пшаніцы.

З другога боку, дунайскі плян Тард'е марыць адкрыцьцё дунайскім краінам доўгатэрміновых крэдытаў з мэтай адтэрміноваць патрэбкаючае ім дзіцкаўнае банкрутства. Для ўдзелу ў арганізацыі гэтых крэдытаў Тард'е, як вядома, запрашае таксама Англію, Германію і Італію.

Гэтага кароткага нарысу дунайскага пляну Тард'е даволі, каб пераканацца, што па сутнасьці гэта толькі новая спроба на стары лад. Сапраўды, ужо на працягу году год, у сувязі з абвастраньнем сусьветнага с.-г. крызісу, мы заўсёды сустракаемся з боку французкага імпэрыялізму з рознымі праектамі «дапамогі» аграрным краінам Паўднёва-Ўсходняй і Цэнтральнай Эўропы. Бясконцыя «аграрныя» канферэнцыі, столькі-ж шматлікія, колькі і безвыніковыя, якія чаргуюцца на працягу трох год пад апекай Парыжу, нарэшце, нават славутая пан-Эўропа набожчыка Брыяна, па сутнасьці справы прасьледвалі ўсе адну і тую-ж мэту: **умацаваць становішча аграрных васалаў французкага імпэрыялізму на ўсходзе Эўропы.**

Трэба толькі адзначыць, што да ўсіх тых матываў, якія прымушалі французкіх імпэрыялістаў зварачаць сваю пільную ўвагу на ўсходнюю Эўропу, мінулы год дадаў яшчэ адзін вельмі важны матыў. Выступленьне Германіі з праектам аўстра-германскага мытнага саюзу прымусіла апчаяніцца французкіх імпэрыялістаў, якія ў тым праекце ўбачылі зародак надыходзячага аншлюсу, палітычнага аб'яднаньня Германіі з Аўстрыяй і стварэньне новай вялікай Германіі.

Усім памятна ўражаньне, выкліканае ў колах французкай буржуазіі апублікаваньнем аўстра - германскага пратаколу аб намеры абодвух бакоў заключыць мытны саюз. Па сутнасьці кажучы, гэты пратакол быў прычынай краху палітычнай кар'еры Брыяна, ворага якога зараз-жа закрычалі: «Вось да чаго давёў нас брыянаўскі пацыфізм».

Дунайскі плян Тард'е прадстаўляе сабой прафілактычны сродак супроць паўтарэньня ў будучым спроб пакшталт аўстра - германскага мытнага саюзу. **Плян Тард'е заключаецца ў тым, каб зканамічна зьвязаць Аўстрыю і Вэнгрыю з падвасальнай французскаму імпэрыялізму Малой Антантай і, такім чынам, зканамічна «адарваць» Аўстрыю ад Германіі.** У гэтым, з пункту гледжаньня французскага імпэрыялізму, і заключаецца асноўны сэнс праекту дунайскай федэрацыі.

Уся справа, аднак, у тым, што дунайскія лятуценьні пана Тард'е сустракаюць нямала перашкод на шляху да свайго ажыцьцяўленьня. Зьяўляючыся простым выпікам і азначэньнем супярэчнасьцяй імпэрыялізму, плян Тард'е ў сваю чаргу натыкаецца па гэтыя супярэчнасьці пры спробах яго ажыцьцяўленьня. Германія і Італія ўсяляк імкнуцца перашкодзіць яго ажыцьцяўленьню. З гэтай мэтай Германія вядзе актыўныя перагаворы з Румыніяй аб прэфэрэнцыяльных тарыфах, каб такім чынам, адцягнуць Румынію ад дунайскай камбінацыі Тард'е. Італія са свайго боку вядзе перагаворы з Аўстрыяй, Вэнгрыяй і Румыніяй. Што датычыць Англіі, дык яна вядзе ў гэтым пытаньні складаную гульню. З аднаго боку, Англія ўяўляе сабе тое, што ажыцьцяўленьне дунайскай федэрацыі азначала-б вялізарнейшае ўмацаваньне французкай гегемоніі на эўрапэйскім кантынэнце. З другога боку, Англія схільна выкарыстаць дунайскую камбінац